ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 153 СЕРАДА, 5 ліпеня 1933 г. № 153

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК УсеКП(б) ПЕРШАМУ ЎСЕКАЗАКСТАНСКАМУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

ЦК УсеКП(б) горача вітае першы Ўсе казакстанскі зьезд ударнікаў калгасных палёў. Калгасьнікі-ўдарнікі Казакстану! Перад вамі вялізарная задача—ператварыць калгасы Казакстану ў сапраўдныя крэпасьці сацыялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі. Перад вамі важнейшая задача—у найкарацейшы тэрмін зрабіць Казакстан перадавым атрадам сацыялістычнага жывёлаводзтва на Ўсходзе.

Калгасы Казакстану маюць для ажыцьцяўленьня гэтых задач усе матар'яльныя магчымасьці, якія забясьпечваюцца ленінскай нацыянальнай палітыкай нашай партыі. Яны маюць бальшавіцкіх арганізата аў барацьбы за большасьць у калгасах—палітаддзелы МТС, у якія партыя паслала сваіх лепшых людзей.

ЦК УсеКП(б) упэўнен, што зьезд калгасьнікаў ударнікаў яшчэ мацней згуртуе калгасьнікаў Казакстану вакол савецкай улады, супроць ворагаў калгаснага ладу, за высокую якасьць уборкі збожжа, за захаваньне і памнажэньне калгаснага стада і забясьпечыць ператварэньне казакстанскіх калгасьнікаў у заможных працаўнікоў калгасных палёў.

ЦК УсеКП(б).

ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ ВЫКАНАЛА ПЛЯН ВОРЫВА ПАПАРУ.

30 чэрвеня Заходняя вобласьць выканала заданьне партыі і ўраду па ўздыме 700 тыс. гектараў чыстых папараў на 103 проц.

Па БССР на 1 ліпеня плян уздыму папараў выканан на 54,1 проц. Узарана 227.026 гектараў.

Такім, чынам, Заходняя вобласьць абагнала БССР у сацыялістычным спаборніцтве. Наша задача—неадкладна мабілізаваць актыўнасьць калгасьнікаў і працоўных адна собнікаў на сканчэньне ў бліжэйшыя дні ўздыму папараў, поліва і разгортваньня падрыхтоўкі да ўборкі, каб не аддаць пярэшынства, заваяванага рэс ублікай у часе веснавой сяўбы.

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ПЕРАДАВІКАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВЁСКІ— ДЭЛЕГАТАМ 2-га РАЁННАГА ЗЬЛЁТУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ!

САКРУШАЮЧЫ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КЛЯСАВАГА ВОРАГА, СТВАРАЮЧЫ МОЦНУЮ ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ, ЗРОБІМ УСЕ КАЛГАСЫ БАЛЬШАВІЦКІМІ, А КАЛГАСЬНІКАЎ—ЗАМОЖНЫМІ.

Наша слова дэлегату зьлёту.

Таварыш дэлегат! Ты камандыраваны ад свайго калгасу на 2-гі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў. Ты маеш гонар быць у ліку прадстаўнікоў лепшых змагароў за новы калгасны лад, за новае сацыялістычнае жыцьцё. Але, іменна гэтым на цябе ўскладаюцца і адказнейшыя абавязкі дэлегата: ты абавязаны прыняць актыўны ўдзел у работах зьлёту, падзяліцца сваімі яго дэлегатамі добрым вопытам перамог і горкімі ўрокамі прарываў свайго калгасу, ты абавязаны за два дні зьлёту ўспрыняць усё, што ёсьць лепшага ў іншых калгасах, усьвядоміць усё, што скажуць табе прадстаўнікі камуністычнай партыі, каб перанесьці ўсё гэта ў жыцьцё і работу твайго калгасу.

Чатыры месяцы таму назад—у пачатку сакавіка—адбыўся наш першы раённы зьезд ударнікаў калгаснай працы. Гэта быў зьезд падрыхтоўкі да галоўнага бою арміі ўдарнікаў—да веснавой пасеўнай кампаніі. Вялікія абавязацельствы ўзялі на сябе ад імя сваіх калгасаў дэлегаты гэтага зьезду і замацавалі іх у сацыялістычным дагаворы.

Настаў час, калі кожны калгас—удзельнік гэтага спаборніцтва, павінен запытаць у астатніх: „Добра. У вас быў дагавор. А як-жа вы, дарагія таварышы, яго выконвалі?". Настаў час, калі спаборнічаючыя з намі рабочыя і калгасьнікі Менскага і Гомельскага раёнаў, разам з рабочымі і калгасьнікамі Ярцаўскага раёну, Заходняй вобласьці, запытваюць у нас: „Як-жа вы, таварышы па спаборніцтве, думаеце: чаму засталіся вы ў самым хвасьце нашага спаборніцтва, у тыле яго, ці не пара вам узяцца за работу сапраўды па-новаму, па-калгаснаму, за работу так, як вучыць нас камуністычная партыя і правадыр наш таварыш Сталін?". І нам патрэбна даць на гэта ясны адказ і пры тым адказ такі, які дапамог-бы выцягнуць нашы калгасы на перадавую лінію, які дапамог-бы зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгасьнікаў—заможнымі.

Для гэтага-та і скліканы наш сёньняшні зьлёт, для гэтага-та і паслалі цябе дэлегатам на гэты зьлёт.

Будзем адкравенныя і прамыя. Партыя вучыць нас разгортваць самакрытыку. Лепшыя ўзоры бальшавіцкай самакрытыкі паказвае нам партыя і яе Цэнтральны камітэт. Лепшым узорам бальшавіцкай самакрытыкі зьяўляецца тэлеграма першага сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало і старшыні Саўнаркому БССР тав. Галавзеда ад 3-га чэрвеня, у якой яны адкрыта і чётка ўскрылі прычыны прарываў у пасеўнай кампаніі па Віцебшчыне, паказалі, не зважаючы на асобы, на недахопы ў нашай рабоце і тут-жа далі бальшавіцкія паказаньні, як гэтыя недахопы выправіць. Гэтыя паказаньні нам трэба добра ўдміць. Яны, разам з іншымі дырэктывамі партыі і ўраду, дапамагаюць нам паставіць работу так, каб яна давала патрэбныя рэзультаты.

А пасеўную Віцебшчына правяла дрэнна. Чаму? З-за нашай уласнай неарганізаванасьці, з-за адсутнасьці практычнага кіраўніцтва кожным калгасам, кожнай брыгадай, з-за слабасьці барацьбы з кулаком, варом, лодырам і дэзарганізатарам, з-за таго, што яшчэ шмат дзе ня хочуць пасварыцца з «суседам», які шкодзіць нашай справе, з-за таго, што ня была прасякнута ўся наша работа сацыялістычным спаборніцтвам.

Кулак—ён хітры вораг.

Іспадцішка ён імкнуўся ўнесьці сумненьне, затрымаць гатоўнасьць калгасьнікаў выканаць паказаньні партыі і ўраду аб раньняй сяўбе. І там, дзе калгасьнікі папаліся на гэтую вудачку, мусіць сільна зараз шкадуюць яны аб гэтым, бо ўсюды раньнія пасевы далі пралесьнейшыя ўсходы, дадуць высачэйшыя ўраджай. Расказаць аб гэтым—твой абавязак, таварыш дэлегат.

Упусьціўшы тэрміны, усё-ж можна было іх навярстаць. Але тут перашкаджала ва многіх калгасах недысцыплінаванасьць і неарганізаванасьць, якую насаджаў клясавы вораг.

Возьмем, напрыклад, калгас «Прагрэс», Віцебскага сельсавету. Ёсьць у калгасе гэтым выгада Воўкава. Аднойчы селькоры ўзяліся пісаць увесь распарадак дню гэтай брыгады і атрымаўся такі малюнак:

«У 6 гадзін 15 мін. (замест 4-х) толькі пачалі зьбірацца на конны двор. Буцянавы Павал і Савелі, Кандраценка, Глебанкоў Савелі на работу выехалі ў 7 гадзін, а Башмакоў Грышан выехаў у поле ў 7 г. 15 мін. А ўжо ў 8 г. 30 мін. адпраглі на сьнеданьне і коней пакінулі ў полі. Дзьве гадзіны працягвалася сьнеданьне і а палове 3-й гадзіны выпраглі на поўдзень. Пасьля абеда Павал Буцянаў на поле выехаў у 5 г. 30 мін., Савелі Буцянаў—у 5 г. 40 мін., Глебанкоў—у 6 г., Буцянаў Максім—у 6 г. 15 мін., а ў 8 г. 30 мін. скончыўся рабочы дзень. Брыгадзір Воўкаў на полі не работаў. У рэзультаце на 10-ці конях за дзень узаралі ўсяго 1,65 га, па 0,16 га на коня». Такая работа працягвалася не адзін дзень і ў рэзультаце калгас «Прагрэс» скончыў сяўбу 20 чэрвеня.

Дзівіцеся, таварыш дэлегат, ці ня было гэтакжа і ў тваім калгасе і паразмысьлі каму наруку грала такая работа.

Дапусьціўшы такія справы, дапусьціўшы да гэтага яшчэ ворыва з агрэхамі, дрэнную задзелку насеньня, наогул дрэнную якасьць работ, многія калгасы зараз ўпэўніваюцца ў тым, як абкруціў іх клясавы вораг, дзейнічаючы ціхай сапай.

А нарэдка гэты вораг дзейнічае і пад прыкрыцьцём партыйнага білета, прабраўшыся ашуканствам у партыю, каб шкодзіць ёй. Вось калгасьнікі калгасу „Новае жыцьцё", Старасельскага сельсавету, ведаюць Сямёнава як камуніста. А Сямёнаў расказвае ім байкі супроць калгасу, заклікаючы «не асабліва утруждаць сябе на рабоце", сам спазьняецца на работу, а часам зусім прагульвае. Ці ня ясна, што гэта—вораг, прыкрыўшыйся партыйным білетам.

Утройчы небясьпечней гэткі вораг, бо камуністу калгасьнік верыць, за камуністам ён ідзе, бо камуніст—гэта часьціна ленінскай партыі, на чале якой стаіць т. Сталін і якая кіруе будаўніцтвам сацыялістычнага жыцьця. Вось чаму наша партыя асабліва ўважліва прыглядаецца да сваіх членаў, правярае іх і выкідвае з сваіх радоў тых, хто камуністам на самой справе не зьяўляецца. Зараз партыя праводзіць чыстку сваіх радоў і заклікае ўсіх добрасумленных працоўных дапамагчы ёй у гэтай адказнай рабоце, каб ніводзін вораг і дапаможнік ворага не засьмечваў яе ленінскіх радоў, каб усе недахопы былі выпраўлены.

Чыстка партыі вучыць нас, як трэба ўзьнімаць сваю пільнасьць, як трэба ажыцьцяўляць самакрытыку, як трэба змагацца за генэральную лінію партыі.

Было-б няправільна думаць, што ўсюды ў нас на Віцебшчыне пасеўная кампанія прайшла дрэнна. Сярод дэлегатаў зьлёту ты сустрэнеш многіх прадстаўнікоў перадавых, моцных калгасаў, якія ўзялі на сябе абавязацельствы выканалі ў тэрмін і добрасумленна, выканалі таму, што моцна трымалі дадзенае слова, што дзейнічалі так, як вучыць нас партыя, як паказвае нам урад. Дэлегаты калгасаў імя 1-га мая і „МОПР"—Сяліцкага сельсавету, «Свабода»—Старасельскага, «Наер лэбн»—Віцебскага, „Чырвоны партызан"—Замастоцкага, „Індустрыя"—Бараўлянскага, „Новы сьвет"—Міхалёўскага, „Чырвоны ўдарнік—Ялагінскага, „Заходняя Дзьвіна"—В. Летчанскага, калгасьнікі брыгад Шылава (Машканы) і Гусакова (Замасточча) раскажуць на зьлёце (а мы ўпэўнены, што яны на зьлёце будуць вельмі актыўнымі), як яны змагаліся за пасеўны плян, за раньнюю сяўбу, за добрую якасьць пасеўных работ і якія вялікія рэзультаты ад гэтага атрымоўваюцца. У сёньняшнім нумары „Віцебскага пралетара" мы друкуем артыкул тав. Гусакова. Прачытай яго ўважліва, захавай гэты нумар газэты, каб прачытаць артыкул Гусакова ўсім калгасьнікам твайго калгасу. Удумайся добра ў яго словы, словы сапраўднага ўдарніка: „Так, папрацавалі, але затое ўраджай—проста ўкраінскі і сьмела ручаюся, што пашукайце ў любым калгасе сельсавету—ня знойдзеце такіх добрых хлябоў, такой чыстай і густой бульбы, як нашы. З хлебам будзем, засыпаемся бульбай, будзем заможнымі, дзяржаве ў першую чаргу накіруем абозы хлеба і бульбы, раней тэрміну выканаем наш сьвяты абавязак".

Вось гэтага-та нам трэба дабіцца ва ўсіх без выключэньня калгасах.

А вось і з праполкай у нас справы ідуць дрэнна. Пустазельнем зарастаюць палі ва многіх калгасах. Пустазельле забірае з глебы соки, якія так патрэбны збожжу, бульбе, гародніне, каб даць больш ўраджай. Вось ты, ударнік і дэлегат зьлёту ўдарнікаў, павінен узяцца за справу праполкі так, каб зьнішчыць гэтае пустазельле. А „каб зьнішчыць-жа пустазельле, для гэтага не патрабуецца нічога іншага апроч сумленнай работы, апроч клопатаў аб сваёй гаспадарцы, апроч таго, каб сэрца ў цябе хварэла за агульную справу. Пустазельле на полі там, дзе ў калгасе шмат кулацкага сьмецьця. Вымесьці гэта сьмецьце, ачысьціць ад яго свае рады,—і пустазельле в поля зьнікне, быццам яго і ня было".

Вымяці гэтае кулацкае сьмецьце са свайго калгасу, арганізуй справу так, каб уся твая брыгада, увесь твой калгас работаў не пакладаючы рук покуль ніводнай сорнай травінкі не застаецца сярод пасеваў.

Да ўборкі падрыхтуйся так, каб ні адна зярніна ня была згублена. Строга прытрымлівайся паказаньняў партыі і ўраду і тады твой калгас зьбярэ з поля ўсё, што вырасла, не растраціць каштоўнага зярна па ветру, на зямлі, па дарогах.

Калгаснае поле—гэта ня вузенькая аднаасобная палоска. Ня ўсюды адначасова сазраваюць пасевы. І калі чакаць, покуль усё пасьпее, на многіх вучастках ветрам разьвеецца пасьпеўшае зярно, пачне асыпацца пасьпеўшая бульба і гародніна. Пачынаць уборку па вучастках, па меры сазраваньня—вялікая справа, якая захавае для калгасу сотні пудоў ураджаю.

Здаецца, кадасок—дробная рэч. А колькі такіх каласкоў рассыпаецца ў час уборкі і перавозкі. Калі граблямі прагрэбці зжаты вучастак, калі ў кожнай жнейкі прыладзіць зернаўлавіцель, калі на кожную кялегу пасьціланць падсьцілку, калі заглядаць, каб з малатарні салома выходзіла добра ачышчаная ад зярна і каб добрае зярно ня ішло ў палову, калі пераараць бульбавішча пасьля копкі, калі прыладзіць ядзегі так, каб бульба і гародніна не рассыпаліся пры перавозцы—падлічы колькі пудоў з кожнага гектара будзе захавана ад страты.

Ураджай трэба пільна ахоўваць, каб ён ня быў паменшаны крысамі з чатырма лапкамі і кулацка-вароўскімі крысамі з двума заграбушчымі лапамі.

Трэба, каб кожны калгас скарыстаў усе выгады, якія даюцца новым законам аб абавязковай пастаўцы с. г. прадукцыі дзяржаве. Вось вазьмі, таварыш, свой калгас. Вы ўжо ведаеце колькі якой прадукцыі трэба здаць дзяржаве ў парадку абавязковай пастаўкі, у парадку падатку. І ад саміх калгасьнікаў залежыць павялічэньне часткі ўраджаю, якая, пасьля здачы дзяржаве і засыпкі насенных фондаў, застанецца для разьмеркаваньня і калгаснага гандлю. Лепш будзе праведзена праполка, ня будзе дапушчана варыўство—больш застанецца калгасу, бо паставка дзяржаве ўстаноўлена цьвёрда і ўсялякія сустрэчныя планы катэгарычна забароненыя.

Але разам з тым трэба цьвёрда памятаць, што паставка дзяржаве—гэта першы абавязак, гэта—закон. Для калгасаў, якія ў мінулыя гады наплявацельскі адносіліся да дзяржаўных абавязацельстваў, гэты закон, як гаварыў тав. Каганові, зьяўляецца цьвёрдым папарэджаньнем. Што-б ні сеялі ў калгасе, а вызначаную колькасьць дзяржаве ёц абавязаны здаць.

Перадавыя калгасы ўжо зараз рашылі здачу дзяржаве прадукцыю правесьці раней вызначаных урадам тэрмінаў. Калгасьнікі калгасу «Малая Чэрніца» заявілі ў сваім зваротце:

«Хлеб мы будзем здаваць дзяржаве непасрэдна з-пад малатарні, з першага абмолоту. Азімыя культуры—жыта і пшаніцу зьвезьці на загатоўчы пункт у жніўні месяцы ў пяць дзён з пачатку іх малацьбы. Здачу (паставку) яравых збожжавых культур пачаць у жніўні месяцы і поўнасьцю скончыць у верасьні.

Бульбу ў мінулым годзе мы вазілі на загатоўчы пункт непасрэдна з поля, таму мы выканалі заданьне датэрмінова. У гэтым годзе таксама з першай копкі, непасрэдна з поля, мы павязем бульбу на загатоўчы пункт і 78,75 тон абавязваемся выканаць за пяць дзён у верасьні месяцы».

Яны заявілі, што першымі ў раёне выканаюць свае абавязкі перад дзяржавай. Але нам здаецца, што яны трохі занадта вазгардзіліся, бо зараз ужо многія калгасы рашылі выканаць загатоўкі ў больш раньнія тэрміны. Вось на зьлёце ўдарнікаў і трэба абвясьціць сацыялістычнае спаборніцтва на хутчэйшае выкананьне першага запаведу калгасу—здачу прадукцыі дзяржаве. У аснову гэтага спаборніцтва павінны легчы, бязумоўна, сьціслыя тэрміны ўборкі, пачатку малацьбы не пазьней як за 5 дзён пасьля пачатку ўборкі, вывазка збожжа на загатавіцельныя пункты адразу з малатарні; бульбы і гародніны—непасрэдна з поля, з першай копкі.

Гэтае спаборніцтва ўзьніме і ўмацуе нашы калгасы і твой доўг ударніка быць застрэльшчыкам яго ў сваім і суседніх калгасах.

Усю вашу работу паставім на рэйкі сацспаборніцтва! Учора выехала дэлегацыя Віцебшчыны на раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Гомельшчыны, каб прадоўжыць наша спаборніцтва і заключыць дагавор. Заўтра зьлёт пашле дэлегацыю ў Менск з гэтай-жа мэтай. Нам трэба прадоўжыць спаборніцтва і з Ярцавым—раёнам братэрскай савецкай рэспублікі—РСФСР. Вясной мы адсталі ад гэтых спаборнічаючых з намі раёнаў. Зараз—па праполцы мы таксама адстаем ад іх. Заходняя вобласьць ужо перавыканала плян увяньняцьця папару, а ў нас такія сельсаветы, як Шумнянскі, Даўжанскі, Рудніцкі, Мікалаёўскі нават і паловы пляну ня выканалі. Адставаньне далей ударнець нельга. А для таго, каб больш не адставаць, трэба разгарнуць сацспаборніцтва ўнутры раёну—сельсавет з сельсаветам, калгас з калгасам, брыгада з брыгадай, калгасьнік з калгасьнікам і, канешне, дэлегат зьлёту ўдарнікаў з другім дэлегатам. Сацспаборніцтва—вялікая сіла. Яно гаворыць: адзін працуе добра, другі лепш—даганяй лепшых, падцягвай адстаючых.

Камуністычная партыя кіруе вашай работай і барацьбой. Заўсёды ідзі за партыяй, выконвай яе паказаньні.

Вітаючы цябе, дэлегат, з адчыненьнем зьлёту ўдарнікаў, мы ўпэўнены, што на зьлёце і ў сваім калгасе ты будзеш актыўным і адданым барацьбітом за новы калгасны лад, за бальшавіцкія калгасы.

ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ, ЯК УДАРНІКІ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ.

Таварышы калгасьнікі-ударнікі Віцебшчыны!

Партыя і ўрад паставілі перад намі як адну з асноўных задач 1933 год ператварыць у год высокай якасьці работы на ўсіх франтох разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы, рабочыя і ІТР заводу „Чырвоны мэталіст", усьвядоміўшы гэтыя задачы, пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі, з посьпехам, датэрмінова выканалі прамфінплян 2 га кварталу. Па суме выпуску прадукцыі наш прамфінплян выкананы на 100,62 проц. Мы таксама, асабліва ў апошні час, у гонар чысткі радоў ленінскай партыі, значна ўзьнялі якасныя паказальнікі прамфінпляну. Брак па ліньці ў сярэднім даходзіў да 17—18 проц. Цяпер паасобныя рабочыя паказваюць прыклады ўдарнай барацьбы за якасьць работы. Фармаўшчыкі Катовіч і Макараў брак па сваёй дэталі—паваротная рама торфяналежкі—давялі да 4 проц. замест 11—12 проц. раней, фармаўшчыкі Гуліды, Еўдакімаў, якія ў гэтым годзе скончылі ФЗВ мэталістаў, таксама ўдарна змагаюцца за якасьць: першы—на фляцах да наждачнага варштату брак выжывае канчаткова, другі на зубчатках да жмыхадрабілак 29 чэрвеня з 416 штук даў толькі 15 шт. браку. Такіх-жа барацьбітоў за якасьць мы маем таксама па астатніх цэхах. Токар Калмыкэнка, сьвярдлоўшчык Драбкін, электраваршчык Вярхоўскі, дзесяткі іншых таварышоў уключыліся ў актыўную барацьбу за высокую якасьць.

Але мы ня добра змагаліся за ня менш важную задачу—за своечасовае сканчэньне сяўбы, за падняцьцё ўраджайнасьці ў сваім падшэфным Бабініцкім сельсавеце, нягледзячы на тое, што мы спаборнічаем з рабочымі-мэталістамі в. Ярцава, Заходняй вобласьці. Пралетарскае шэфства мы не ператварылі ў магутны вагар забясьпячэньня посьпехаў сяўбы.

Мы таксама зацягвулі сканчэньне сяўбы па прыгарадняй гаспадарцы, але цяпер навёрствае з правядзеньнем праполкі. Мы для гэтага кожнаму цэху далі вызначаны выходны дзень, каб усім цэхам пачаргова на працягу рабочага тыдню даць прыгарадняй гаспадарцы дастатковую колькасьць рабочай сілы. Аграмя таго, улічыўшы страдны час, 26 чэрвеня вызначылі як выходны дзень і ўсім заводам выйшлі на праполку, забясьпечыўшы выкананьне 75 проц. пляну праполкі.

Мы выпусьцілі 12 тыс. акучнікаў і 14500 плугоў, але па акучніках мы ня вытрымалі тэрміну, даўшы іх са спазьненьнем на тры дні. Мы ня выканалі да тэрміну заказу па выпуску запчастак да ўборачных машын, тэрмін сканчэньня якіх быў вызначаны ўрадам 1 ліпеня.

Перад намі стаіць задача—у бліжэйшыя дні скончыць стары заказ і адначасова ўзяцца па-баявому за выкананьне новага заказу па запчастках да жнярак і касарак, а таксама паўдарнаму дапамагчы прымацаваным да завода 4 сельсаветам—Бабініцкаму, Рудніцкаму, Ялагінскаму і Мікалаёўскаму ў рамонце ўборачнага інвэнтара, падрыхтаваць увесь іх інвэнтар да наступаючай уборачнай кампаніі, узмацніць нашу шэфскую работу наогул у Бабініцкім сельсавеце.

Пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі мы з гэтай задачай справімся.

Таварышы калгасьнікі-ударнікі!

Савецкі саюз, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на чале з любімым правадыром сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным, пасьпяхова завяршыў сяўбу. Перадавыя раёны нашай вялікай краіны па-баявому рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі і хлебаздачы, рад паўднёвых раёнаў ужо прыступілі да пастаўкі збожжа, па ўдарнаму выконваючы свой абавязак перад дзяржавай.

Мы заклікаем вас, таварышы дэлегаты зьлёту і ўсіх калгасьнікаў, сьледаваць нашаму прыкладу ў барацьбе за тэмпы, за высокую якасьць работы, сьледаваць прыкладу перадавых раёнаў, па-ўдарнаму падрыхтавацца і правесьці ўборку ўраджаю, у тэрмін і без страт, цалкам і поўнасьцю ахаваўшы яго.

Перад вамі стаіць ударная задача—адразу-ж адначасова з уборкай прыступіць да абмалоту і з першага-ж абмалоту арганізаваць хлебаздачу сваёй дзяржаве.

Рабочыя, служачыя і ІТР «Чырвонага мэталіста» ўпэўнены, што гэты наш зварот знойдзе жывы водгук у вас—ударнікаў сацыялістычнага земляробства—і вы яго ператворыце ў канкрэтныя бальшавіцкія справы.

Нахай жыве камуністычная партыя і правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін!

Нахай жыве змычка рабочае клясы і калгаснага сялянства, будуючых новае бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва!

Па даручэньні рабочага калектыву:
Сэкратар парткалектыву Ваданосаў.
Дырэктар заводу Красноў.
Старшыня заўкому Каралёў.
Героі першай пяцігодкі:
Яфімаў, Сандлер, Шутаў, Міхаш, Дабрамыслаў, Галадніцкі, Фіяла, Фрыдман, Горскі, Левінтаў.
(Прынята на пахавых рабочых сходах).

КАЛГАСЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ СУСТРАКАЮЦЬ ПЛЕНУМ ГАРКОМУ ПАРТЫІ І РАЁННЫ ЗЬЛЁТ.

СТАРАЕ СЯЛО.

РАЗГОРТВАЕЦЦА КАСЬБА.

Лепш за ўсіх ідзе ў касьбе калгас „Труженік". На 3 ліпеня 15 га сена ўжо зьвезена ў пуню. За апошнія дні выходзяць касіць 20—25 касцоў, брыгадзіры Зубрыцкі і Максімаў самі таксама выходзяць касіць. Нядрэнна справа абстаіць з сенакашэньнем у калгасе «Камунар». На касьбе канюшыны работаюць дзьве касаркі. З ліпеня на ўборцы канюшыны работала 15 жанчын.

Горш справа абстаіць з сенаўборкай у калгасе «1-е мая». На 3 ліпеня скошана 6,15 га. Таксама дрэнна ідзе сенакашэньне ў калгасе «Новае жыцьцё». Старшыня Цярноўскі да справы адносіцца халатна, лічыць, што з сенаўборкай пасьпее. Усяго выходзіць касіць 5—6 касцоў.

Гэтыя калгасы слаба разгарнулі падрыхтоўку да пленуму гаркому КП(б)Б і зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў.

Грынман.

АБОЗ З СЕНАМ ІМЯ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ.

3 ліпеня адбылася нарада старшынь калгасаў Старасельскага сельсавету. На нарадзе пастанавілі ў гонар пленуму гаркому КП(б)Б і зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў, 7 ліпеня арганізаваць чырвоны абоз з сенам імя чысткі партыі. У гэтым абозе будуць удзельнічаць калгасы «Камунар», „Свабода", «2-я пяцігодка» і аднаасобны сэктар.

БАБІНІЧЫ.

ТЭМПЫ ЎЗМОЦНЕНЫ.

Усяго па Бабініцкім сельсавеце на 4 ліпеня скошана 45,6 га сенажаці, з іх па калгасным сэктары—36,6 га, аднаасобнікі—9 га. Наперадзе ўсіх калгасаў ідзе калгас „Пралетарская перамога", у якім скошана ўжо 16 га. З сёньняшняга дню тэмпы касьбы па ўсіх калгасах узмоцнены. Уся асноўная сіла перакінута на ўборку сенажаці.

Янушэвіч.

ЗАМАСТОЧЧА.

„М. ЧЭРНІЦА" І „ЗАМАСТОЧЧА" ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛЯН МЯСАЗДАЧЫ.

Калгасы «М. Чэрніца» і „Замасточча" сустракаюць пленум гаркому КП(б)Б, раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Віцебшчыны выкананьнем гадавога пляну па мясаздачы.

Па ўсіх калгасах узмоцненымі тэмпамі разгарнулася ўборка сенажаці. За два дні калгас „М. Чэрніца" ўбраў сенажаці 31 га. Нормы перавыконваюцца. Замест 0,33 га лепшыя ўдарнікі: Балтковы А. і Л. скашваюць 0,48 га.

М.

ЯЛАГІ.

СЁНЬНЯ ПРЫБЫВАЮЦЬ АБОЗЫ З СЕНАМ.

У сувязі з падрыхтоўкай да пленуму гаркому партыі і зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў на калгасах Ялагінскага сельсавету значна ўзьняліся тэмпы ўборкі сенажаці. Калгас імя Гамарніка 3 ліпеня скасіў 10 га лугу, «Барацьбіт»—9 га, імя Чырвонай арміі—10 га. Касьба разгорнута па ўсіх калгасах.

У гонар пленуму і зьлёту, сёньня арганізуюцца чырвоныя абозы з сенам з калгасаў імя Гамарніка, «Барацьбіт» і імя Чырвонай арміі.

Паўлючэнка.

МІКАЛАЁВА.

ТАМ, ДЗЕ ДРЭННА РЫХТАВАЛІСЯ ДА ЗЬЛЁТУ.

Слабая падрыхтоўка да пленуму гаркому партыі і зьлёту дала свае рэзультаты. З усіх калгасаў Мікалаёўскага сельсавету да касьбы прыступілі толькі тры: калгас «Пяцігодка» скасіў 5 га, „Чырвоны Кастрычнік"—1,3 га і «Сілач»—5,5 га.

Масавая работа па арганізацыі чырвоных абозаў з сенам у Мікалаёве не праведзена.

Р.

За пасьпяховае правядзеньне ўборкі, за выкананьне абавязкаў перад дзяржавай датэрмінова, за бальшавіцкія калгасы!

Перадавыя ўдарнікі-дэлегаты зьлёту дзеляцца вопытам сваёй работы.

Узятыя тэмпы здадзены ня будуць.

Слова тав. ВЕТАШКОВА,

старшыні калгасу «МОПР», Сялюцкага сельсавету, дэлегата першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Наш калгас першым па Сялюцкім сельсавеце скончыў веснавую пасеўную кампанію, з гонарам вытрымаўшы тэрміны, вызначаныя нам партыяй і ўрадам. Калгас на дасягнутых посьпехах ня спыніўся. Мы маем буйныя перамогі ў ворыве папару, якое ў нас скончана, мы завяршылі і першую праполку. Акрамя гэтага мы, сацыялістычным буксірам, дапамаглі адстаючым калгасам Рудніцкага сельсавету—„Бальшавік", імя Войкава, імя Дзяржынскага, і калгасам імя Карла Маркса і „Чырвоны чыгуначнік", Сялюцкага сельсавету вылезьці з прарыву і скончыць веснавую пасеўную кампанію.

Перамогі, атрыманыя калгасам „МОПР", я тлумачу тым, што прыехаўшы з усебеларускага зьезду ўдарнікаў, дае я атрымаў баявую зарадку,—я шырока ўжываў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва паміж асобнымі калгасьнікамі і сярод брыгад. Мы бязьлітасна выкідвалі са сваіх шэрагаў лодыраў, рвачоў, прагульшчыкаў і кулакоў, якія ставілі нам палкі ў калёсы, перашкаджаючы будаваць новае жыцьцё.

Зараз, калі мы атрымалі ганаровае права ўдзельнічаць у другім раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў, калгасьрікі калгасу „МОПР" запэўніваюць гарком партыі і гарсавет, што ўзятыя тэмпы здадзены ня будуць, што мы будзем біцца за тое, каб у гэтым годзе кожны калгасьнік нашага калгасу стаў заможным.

Бярэм на сябе абавязкі скончыць сенакашэньне да 8 ліпеня.

Правесьці яшчэ дзьве праполкі гароднины і адну праполку збожжавых.

Убраць збожжа на працягу дзесяці дзён бяз страт і з першага абмалоту разьлічыцца з дзяржавай.

Вывезьці вызначанае па плане ўгнаеньне для азімых пасеваў і ў пяцідзённы тэрмін скончыць азімы пасеў.

„Ураджай у нас украінскі"...

Слова тав. ГУСАКОВА,

брыгадзіра першай брыгады калгасу «Замастоцча» Замастоцкага сельсавету.

Сказаць па праўдзе, ужо пяць год ня бачылі такога ўраджаю, які зараз на палёх нашага калгасу. Прыдзеш на поле, аж радуешся і лёгка на сэрцы становіцца, адчуваеш, што твая праца дарма не прапала. Радуешся, гледзячы на высокае, густое каласістае жыта, на буйныя і чыстыя аўсы, ячмені і ільны, на густую віку і гарох. Вось і глядзі, што хутка зажаўцеюць пасевы, нальюцца каласы вернем і няхай тады жаткі стракочаць, зрэваюць хлеб, убіраць наша дзяржаўнае багацьце.

Так. папрацавалі, але затое ўраджай—прама ўкраінскі і сьмела ручаюся, што пашукайце ў любым калгасе селсавету, ня знойдзеце такіх добрых хлябоў, такой чыстай і густой бульбы, як нашыя. З хлебам будзем, засыпаемся бульбай, будзем заможнымі, дзяржаве ў першую чаргу накіруем абозы хлеба і бульбы, раней тэрміну выканаем наш сьвяты абавязак. Што гэта так—няма нічога сумненьня. Пагаварыце з любым калгасьнікам маёй брыгады і ён вам лепш сам скажа, што гэта так. Толькі і чутна і на работе і ў вольны час размовы: як лепш убраць, змалаціць, зьвезьці, як хлеб везьці: ці ў мяхох ці без мяхоў. Кожны калгасьнік маёй брыгады хварэе душой за наша агульнае багацьце.

Засьніш вочы на мінуту якую, забудзешся і ўспамінаецца мінулы год, калі людзі працавалі так сабе і ледзь не са сьлязьмі на вачох глядзеў я на лысыя, рэдзенькія пасевы, калі кулаччо і лодыры грызьлі кожны дзень і брыгаду і калгас, калі мы з натугай выканалі загатоўкі.

Успамінаю і першы зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, дзе я даў абяцаньне прыкласьці ўсе сілы, каб стаць на ногі, дабіцца высокага ўздыму, нябачанага дагэтуль. І, як жывыя, стаяць перада мною малюнкі цяжкай работы, якую прышлося вытрымаць на сваіх плячох.

Пачалося з раньняй сяўбы. Адзойчы, здаецца, 15 красавіка, я атрымаў тэрміновае распараджэньне праўленьня заўтра ля ракі пасеяць 5 га аўсу. Пабег я месца глядзець: нічога, крыху макравата, але сеяць можна. Стаю, а самога сумненьне бяре: «ну а калі ня вырасьце, што-ж будзе тады?» Крыху і ня верыў я ў раньнюю сяўбу, але затаіў думку гэтую і распарадзіўся пачынаць. 16-га вышлі мае сяўцы, я прывёз авёс, але тут і падняла-ся валтузьня. Сяўцы ні з месца, хоць кол на галаве цяшы:

— «Ня будзем сеяць»—ды і толькі.

— „Ня прымусіш ты нас у магілу лезьці":

— Чаму ў магілу?

— «Ня сеялі мы так рана».

Хоць разарвіся, проста гора. Нарэшце, угаварыў, пасеялі. Ляжыць насеньне, ня ўсходзіць, а з мяне зьдзекваецца пачалі: „рыхтуй, кажуць, насеньне яшчэ раз". Кожны дзень хаджу на вучастак, пакапаюся, пагляджу на зярнё і страшна: набухае авёс, малаком наліваецца, няма расткоў. Вакол мяне горшы гармідар падымаецца: «шкодзіш ты»—лаюцца.

А праз два тыдні паказаўся авёс, зялёнай шчоткай адзелася поле. Для мяне гэты дзень быў найвялікшым сьвятам, бо ўсе цкаваньні адразу спыніліся. Хто раней ішоў з мяне, вінавата пахілялі галаву пры сустрэчы са мной, сароміліся ў вочы глядзець. Мой аўтарытэт пасьля гэтага значна вырас у брыгадзе. А цяпер пагляджэце на гэты авёс: больш і лепш астатніх, высокі, буйны, густы і пасьпеў раней другіх.

Так прышлося з людзьмі паваяваць. Цяпер для мяне многае ясьней яснага, а тады ня тое было. З самага пачатку зрабіў я памылку: паставіў лодыраў—Ляхоўскага Цімахвея, Шылава Сяргея, Журава Сямёна і Варзопу—разам з лепшымі ўдарнікамі ў адну баразну. Бачу ня клеіцца, здае мая брыгада, зрывае нормы, зрывае заданьне. Здагадаўся і паставіў лодыраў асобна. Рэзультат другі. Лепшыя выпрацоўвалі па 0,6, лодыры—0,35. І што-ж? Заварушыліся мае лодыры. Журавы і Варзоба ўтрох сталі асобна, заключылі сацумову з лепшымі ўдарнікамі і праз 3—4 дні ўчарайшія лодыры давалі больш за лепшую брыгаду.

Вось як перавыхоўваюцца людзі ў калектыўнай працы! Гледзячы на ўсіх і астатнія падцягнуліся. Спаборніцтва дапамагло і, такім чынам, скончыла мая брыгада раней за ўсе брыгады сяўбу і на 25 дзён раней мінулага году. Засеяна амаль у паўтары разы больш мінулага году, дзе толькі аблогі былі, усё паўзаралі, усё пазасеялі і пасеялі па гаспадарску.

Адсяўшыся другім брыгадам дапамаглі і выслалі буксір калгасу імя Сталіна, Рудкоўскага сельсавету. Цяпар узьнята строга ў тэрміны, своечасова. План перавыкананы, прыступаем да баранаваньня і масавай касьбы.

Распрацаваў я ў сваёй брыгадзе ліст да сваіх суседзяў з калгасу «М Чэрніца». Тыя выклік прынялі. Калгасьнікі мае былі абраны адным месцам. У лісьце калгас „М. Чэрніца" абяцае ўтрымаць першынства ў спаборніцтве з намі. „Мелка яны плаваюць, ня выйдзе справа",—заявілі калгасьнікі маёй брыгады. Я думаў таксама. Выраблыі мы працаваць яшчэ больш упарта, чым веснаю; касьбу скончым за 12 дзён, бульбу і яравыя таксама—за 12, а з першых снапоў, з першай баразны бульбы—пакіруем дзяржаве.

Трывожыць мяне адно. Пасеяць мы пасеялі добра, хлеб думаем атрымаць ня менш 3 кгр. на працадзень, але ўраджай зазаўважаецца ня толькі весной, але і ў час уборкі і малацьбы. І на гэтым шляху паўстаюць новыя і вялікія цяжасьці. Я ўлоўнены, што чорным варанньём паляцяць кулакі, злодзеі, жулікі, якія спрабуюць працягваць сваю руку да нашага ўраджаю. Не дадзім, рукі адсячэм! Ніводнае зярнё, ніводная бульбіна ў нас не прападзе. Будзем пільна ахоўваць свой ураджай ад усялякіх прошукаў клясавага ворага, паставім жалезную ахову, бо ахова і ўлік ураджаю—самае галоўнае.

На зьлёце я раскажу больш падрабязна як мы змагаліся за пасеўную кампанію і як мы мяркуем правесьці ўборачную і загатоўчую кампанії.

Шлепакоў Аляксей.

— Хто за Шлепакова?—Запытаў старшыня сходу. Пасьля доўгіх разгоў меркаваньняў, спрэчак ён паставіў гэтае пытаньне на галасаваньне.

Нагалькі дзесяткаў рук рантам узьняліся ўгару. Нехта з калгасьнікаў назад нагнуўся ўбок, зьлёгка ўзьняўшыся з крэсла, імкнучыся падняць руку як мага вышэй.

Калі не галасавалі, дык у куту за печчу ад цьмяна гарачай газоўкі былі бачны толькі цёмныя постаці людзей. Зараз з таго куту заскарузлыя, вялікія рукі блішчэлі далонямі, хістаючыся ў паветры. Лёгкай ухмылкай зьявілі твары ад задаваленьня.

Абіралі на 2-гі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў.

Дагэтуль перабралі амаль кожнага калгасьніка паасобку Але ў кожным знаходзілі нейкую хоць маленькую загану, хоць маленькую прычэпку... а зьлёт гэта ня што небудзь. Ня так проста. Раз ударніка, дык трэба абраць прынамсі ўдарніка, каб гэты чалавек адпавядаў сваёй назьве дэлегата на зьлёт ударнікаў.

Шлепакова Аляксея ў калгасе ведалі, як «сваіх пяць пальцаў» і таму за яго кандыдатуру ўзьняўся лес рук.

— Во, Ляксей, гэта справа іншая.

— Ляксея можна. Ляксей сапраўдны ўдарнік,—сыпаліся галасы.

Яшчэ ніхто ня памятае, калі б Шлепакоў ня выпрацаваў сваёй нормы, калі-б ён адмовіўся ад якой работы ці што іншае...

— Ты, брат, калі ўжо едзеш, дык не дарма едзеш... На проста пасядзець ды паслухаць... Рот, браце, не разявай. Сачы, пільна сачы, хто там будзе толкам... ну... гэта... вучыся як людзі працавалі, як маркуюць працаваць, каб прыехаў і ўсё нам гэта, значыць, выкладзі як на далоні, каб раней іхняга пасьпець іхным мэтадам,—драбяжжаў ад парогу барадаты калгасьнік.

— І таксама кажы... Кажы, ня ўкрывай ніводнае кроплі, як гэта мы, значыць, працавалі ў гэтую вясну. Кажы як і што... Дрэнна, кажы, працавалі ў нашым калгасе.. Праваліліся з сяўбой.

— І цяпер з папарамі,—перабіў яго другі голас.

— Так, кажы, што і з папарам, усё выкладай.. Каб гэта ўсе ведалі, што наш калгас... ну, гэта самае, дрэнны калгас. Дрэнна спраўляліся мы з работай.

— Вось слухай, ды матай на вус,—пажартаваў нехта з хлапцоў над Шлепаковым.

Шлепакоў палкам ахоплены гонарам калгасьнікі яму, больш нікому, даручаюць гэтую вялікую справу. Гэта яму даюць ганаровае імя дэлегата на 2-гі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў.

На дрыжачым, сівенькім твары прабягае лёгкая ўхмылка. Тая самая ўхмылка, калі ён атрымаў першую прэмію за ўдарную работу па пасеўкампаніі.

За тры гады ў калгасе ён прывык да ўсякай работы. Кожная складаная адказная работа ў калгасе для яго яшчэ раз радасьць у жыцьці. Але на гэты раз яму яшчэ больш падавала ахоты і жаданьня працаваць. Яшчэ ўдарцей хацелася дасягнуць вяршынь перамог.

.. Калгас даручае самую адказьнейшую справу дэлегату на 2-гі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў...

Сэрца білася ўдвойчы хутчэй ранейшага.

КАНДЫБА.

Наш калгас будзе сапраўды бальшавіцкім.

Слова тав. Я. С. РАЎКОВА,

нам. старш. калгасу імя Чырвонай арміі, дэлегата 1-га ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Я, адзін з усіх калгасьнікаў Віцебшчыны, атрымаў ганаровае права ўдзельнічаць ад імя Віцебшчыны ва ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў ударнікаў. Гэты вялікі зьезд, які цягнуўся цяць дзён, даў мне многа для зразуменьня таго, як актывісту-ўдарніку трэба ў калгасе працаваць і як ён павінен учыць і весьці за сабой масы калгасьнікаў, паказваць сваім асабістым прыкладам. Пасьля зьезду я даў сабе слова, што ўсе тыя абавязкі, якія прымалі мы ў сваёй адозьве, з гонарам выканаю. Мне яскрава ўрэзаліся ў памяць словы т. Кагановіча, што з гультаём, лодырам і кулаком трэба распраўляцца бязьлітасна, трэба яго выганяць з калгасу для таго, каб ён не перашкаджаў будаваць новае жыцьцё.

І пасьля зьезду я перш за ўсё ўзяўся за ачыстку калгасу ад клясава варожых элементаў, якіх было ў нас многа. Многа кулакоў было выкінута з калгасу. Так, Паціцкі—раскулачаны, сядзеў у калгасе, краў, шкодзіў, яго чамусьці трымалі. Трымалі і Крыжэвіча Рыгора, сына раскулачанага, лодыра і зрыўшчыка працоўнай дысцыпліны. Мне стала яскрава, што гэтым элачынцам не па дарозе з намі, што іх трэба гнаць з калгасу. На першым жа паседжаньні праўленьня я рашуча паставіў пытаньне аб тым, каб іх з калгасу прагнаць, а за шкодніцтва аддаць пад суд.

Пасьля зьезду я быў абраны членам праўленьня калгасу, намесьнікам старшыні і загадчыкам гаспадаркай, і я парашыў сябе апраўдаць. Перш за ўсё я прыняў усе меры для забесьпячэньня калгаса да веснавой пасеўкай—усім сельскагаспадарчым інвэнтаром, збруяй, вяроўкамі І дабіўся таго, што мой калгас сустрэў не падрыхтавана—на 100 проц.

Нашы коні да майго прыходу ледзь цягнулі ногі, і я сказаў сябе: «ну, Якуб, з такімі конямі далёка не паедзеш», і я ўзьўся за іх сур'ёзна. Усіх худасочных коняй забараніў запрагаць, паставіў іх на кругласутачны адкорм, зьмянілі двух дрэнных конюхаў, і да вясны коні таксама былі падрыхтаваны.

Мой галоўны экзамін пачаўся з пачаткам сяўбы. Былі ў нас такія людзі, як брыгадзір 4-й брыгады Цярэшчанка, які хадзіў і хныкаў: „Кулы мы сеем, гразна, коні вязнуць, зернё ўсёроўна загіне". Пачуў я аб гэтым, пабег у брыгаду, пагутарыў з людзьмі, растлумачыў ім, што словы Цярэшчанкі, гэта словы кулака. Прасядзеў я ў гэтай брыгадзе другі дзень, сам з імі працаваў і брыгада выраўналася, а кулацкі падпявала Цярэшчанка пейшоў пад суд. Былі яшчэ такія як Цярэшчанка. Многа прыйшлося паклясьці сіл і здароўя, каб дабіць лодыраў, якія ў пачатку сяўбы страшэнна расьцеразаліся.

У брыгадах я растлумачваў пастановы зьезду, расказваў як павінен ударнік змагацца за сяўбу, і мая праца не прапала дарма. Выкінулі з калгасу лодыраў Мастыку Міхалая, Стрыленка Сяргея Выходзіць на работу сталі замест 7—з 3 гадзіне, працавалі да цемнага.

І зараз, калі мы веснавую пасеўную кампанію скончылі на 25 дзён раней мінулагодняй, калі мы сёньня вывозім на рынак сьвежую бульбу і вялікія гуркі, калі ў нашым жыцьці чалавека ня бачна—я адчуваю, што наша праца дарма не прапала, што ў гэтым годзе мы атрымаем нячуваны ўраджай, якога на нашых палёх ужо каля 10-ці год ня бачылі. А гэта таму, што прыклалі ўсе меры для таго, каб угнаіць нашу зямлю, і 340 га яравога кліку мы ўгнаілі поўнасьцю, заклалі 3500 парнікових рам, пасеялі 146 гектараў бульбы.

Ад свайго шляху я не адступаю, буду змагацца за тое, каб наш калгас зрабіўся сапраўды бальшавіцкім, а калгасьнікі—заможнымі.

Мяне ячэйка паслала на курорт як хворага, але я не паеду. Не патрэбны мне курорты — аддам усё сваё жыцьцё за нашу вялікую справу.

І я вельмі хацеў-бы запрасіць да нас у калгас каго-небудзь з аратараў, гаварыўшых на ўсесаюзным зьезьдзе. Хай пабачуць, што нашы словы дарма не прапалі, што мы змагаліся і ажыцьцяўлялі рашэньні нашай партыі і ўраду, указаньні нашага любімага правадыра тав. Сталіна.

Крукава выканала свой абавязак.

Крукава Домна—радавы баец вялікай калгаснай арміі. Звонку яе не адрозніш ад асульнай масы жанчын, выходзячых на работу, але яе справы далёка не радавыя. Яе справы—гэта вялікая адданасьць справе партыі і ўраду, справе будаўніцтва новага калектыўнага жыцьця.

Домна, в о л я ю агульнага сходу калгасьнікаў, ацаніўшых яе работу, была на раённым зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў.

Моцна ўпіваліся ў галаву Домны словы такіх жа як яна людзей, блізкія, родныя словы аб сваім жа калгасным жыцьці. Сваім практычным умом яна прыстасоўвала: „Ці так як у нас, ці працуем мы так, як калгас імя Чырвонай арміі, Ялагінскага сельсавету?". Тутжа ў думках стройна афармляўся ўвесь шлях далейшай работы калгасу—шлях да ажыцьцяўленьня паказаньняў правадыра—зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў-заможнымі.

І в гэтай думкай Домна, разам з сотнямі іншых дэлегатаў, саласавала за практычную пастанову зьлёту, прымала і падпісвала адозву і з гэтай думкай, заражонай вялікім вытворчым энтузыязмам, ахапіўшым усіх дэлегатаў, 14 сакавіка выйшла на работу, а ўвечары расказала агульнаму сходу аб неабходнасьці ўдарнай работы гэтай вясной. Пасьля гэтага яна заключыла сацумову з калгасьніцай другой брыгады Рыжковай Агаф'яй—таксама лепшай ударніцай калгасу—на тое, хто больш, хто лепш.

17 красавіка амаль на 10 дзён раней мінулагоднага загулі трактары, сталі ўзьнімацца першыя чорныя пласты над Дзьвіной.

Яе трэцяя брыгада спачатку адставала, цягнучыся ў хвосьце іншых брыгад, штодзённыя заданьні зрываліся, людзі разьвінціліся. Норма выказаньня на параконны плуг ледзь дапаўзала да 0,35 га на дзень, забараноўвалі ў два сьляды толькі па 1,5 га, выхады на работу а 7 гадзіне сталі рэгулярным зьявішчам. «Так быць не павінна. Калі брыгада дрэнна працуе, а ў іх ліку знаходжуся і я, дык я вінавата за прарыў»—і Домна пачала дзейнічаць. Сумесна з брыгадзірам гаркому і камсамольцамі брыгады яна пасьля работы робіць падворны абход злосных зрыўшчыкаў працы, а потым праз дзень на вытворчай нарадзе рэзка ставіць пытаньне аб недапушчальнасьці ганебных тэмпаў. У выніку зрыўшчыкі сяўбы былі аштрафаваны працаднямі На заўтра быў забясьпечаны рэзкі зрух, вышлі на работу а 5 гадзіне. Норма 0,35 га ворыва на параконны плуг была апрацінута. Брыгада стала даваць ня менш 0,5 і 3 га баранаваньня і калі пасьля ўдарнай напружанай пяцідзённай работы трэцяя брыгада скончыла разей сяўбу, чымся ўсе іншыя брыгады, дык у гэтым вялізарная заслуга Домны.

А тут пасьпеў прарыў у пасадцы бульбы першай брыгадай. Трэцяй брыгадзе, як скончыўшай сяўбу раней за ўсіх, было прапанавана арганізаваць буксірную брыгаду жанчын для ліквідацыі прарыву. Але жанчыны з трэцяй брыгады «заартачыліся». 18 мая ніводная жанчына ня выйшла. Туды прасачыліся вялікія разважаньні: «Наша брыгада скончыла, мы не абавязаны дапамагаць, хай самі аддуваюцца ня пойдзем, ды і толькі». У выніку 18 мая першай брыгадзе ня было засеяна ніводнага га. І вось, в 12 гадзіне ўначы Домна, мабілізаваўшы камсамольцаў, абходзіць усіх жанчын брыгады, агітуе, угаварвае, даказвае: «Калі першая брыгада ў прарыве, значыцца, што мы таксама ў гэтым вінаваты Трэба заўтра ўсім як адзін выйсьці». Гэта дапамагло. 19 мая буксірная брыгада з трэцяй брыгады, на чале з Домнай, выйшла ў поле і да 20 мая трэцяя брыгада скончыла пасадку бульбы.

У спаборніцтве з Рыжковай Агаф'яй Домна вышла пераможцам, даўшы за час веснавой сяўбы больш 100 працадзён.

І калі сёньня Крукава Домна сумесна з лепшымі ўдарнікамі-калгасьнікамі Кірпічэнка Мітрафанам, Калініным Мацьвеем, Рыжковай Агаф'ей, Рыжковай Натальлей і Арловым знаходзіцца на другім раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў, дык гэта яна па праве заваявала ўдарнай работай у час веснавой сяўбы.

С. РАСКІН.

На пашыраным пасяджэньні савету МТС.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПЕРАТВАРЫЦЬ У КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ.

Гэтымі днямі адбылося пашыранае пасяджэньне савету МТС з удзелам калгасьнікаў-ударнікаў, на якім разьбіраліся пытаньні аб выніках веснавой сяўбы і задачах уборачнай і загатоўчай кампаніі.

Савет адзначыў, што сяўба па раёне дзейнасьці МТС праходзіла абсалютна нездавальняючымі тэмпамі У асноўным сяўба была завершона толькі 20 чэрвеня.

Першымі па сяўбе ішлі калгасы імя Чырвонай арміі (Ялагінскі сельсавет), „Другая бальшавіцкая в я с н а", Заходняя Дзьвіна" (В. Лётчанскі сельсавет). Большасьць калгас ў тэрміны сяўбы, вызначаныя партыяй і ўрадам, ганебна сарвала. Асабліва зацягнулі сяўбу калгас імя Чарвякова (Віцебскі сельсавет), імя Карла Маркса (Сялюцкі сельсавет), імя Леніна (Бараўлянскі сельсавет) і калгас „Капачова" (Ялагінскі сельсавет). Дрэнная падрыхтоўка гэтых калгасаў да пасеўнай кампаніі, невыкананьне ў мінулым годзе заданьня па зяблівым ворыве, слабае разгортваньне сацпаборніцтва і ўдарніцтва, слабая барацьба з кулацкім сабатажам,—прынялі гэтыя калгасы да прарыву.

Аднак, у час папаравай кампаніі ўрокі веснавой сяўбы адстаючымі калгасамі ня ўлічаны. Ворыва папару таксама зацягнулася. Асабліва дрэнна аднесьліся калгасы да вывазкі гною, торфу і вапны (калгасы Віцебскага сельсавету плян вывазкі гною выканалі на 30 проц., В. Лётчанскага,—10 проц.—усяго па МТС на 20 проц.). Такое становішча стварае простую пагрозу зрыва падвышэньня ўраджайнасьці азімых.

Рамонт інвэнтара па ўсіх калгасах раёну дзейнасьці МТС праходзіць дрэнна. Рамонт яшчэ ня скончан. Да гэтага часу загадчыкі вучасткаў, як, напрыклад, тав. Аверка, яшчэ ня ведаюць, якія складаныя малатарні ў іх атрадах патрабуюць рамонту і якога рамонту.

Пашыраны савет МТС адзначыў, што работа трактарнага парку з боку кіраўніцтва МТС, загадчыкаў вучасткаў і вучасткових агранамаў была арганізавана невыстарчальна, у выніку чаго трактары ня мелі поўнай нагрузкі. Замест 20 гадзін прадукцыйнай работы яны давалі толькі 8—10, ня было належным чынам разгорнута сацпаборніцтва і ўдарніцтва ў час веснавой сяўбы сярод трактарыстаў і трактарных атрадаў.

Савет пастанавіў зараз-жа прыступіць да баранаваньня папару і на працягу лета ўтварыць ня менш як трохразовую культывацыю папару, другое ворыва папару скончыць за 15 дзён да пачатку азімай сяўбы. Зараз жа прыступіць да вывазкі гною з калгасных хлеваў і хлявоў калгасьнікаў, а таксама выканаць плян тарфаваньня і вапнаваньня.

У справе падняцьця ўраджайнасьці мабілізаваць усіх калгасьнікаў на своечасовае і добраякаснае правядзеньне праполкі, скарыстаўшы поўнасьцю ўсю рабочую сілу ў калгасах. Праполку правесьці ў адпаведнасьці з пастановай СНК і ЦК: па бульбе—двохразовае рыхленьне і акучваньне, на гароднине—ня менш трохразовай праполкі і рыхленьня з двайным акучваньнем. Па ўсіх калгасах вылучыць камісіі з лепшых калгасьнікаў-ударнікаў па праверцы якасьці праполкі.

Улічваючы ўрокі мінулага году, савет пастанавіў уборку натуральных сенажацяй скончыць на працягу 15 дзён, сеяных траў 10 дзён. Для работы на касарках вылучыць лепшых калгасьнікаў і лепшых коняй, даўшы максымальную нагрузку на машыну. Сушку сена і ўборку праводзіць бяз страт. У кожным калгасе стварыць спэцыяльныя камісіі па праверцы якасьці ўборкі сена, чыстаты касьбы і правільнага закаваньня скошанага сена. За лепшую працу па ўборцы практыкаваць падвышэньне працадзён, а за дрэнную—зьніжэньне. Зараз-жа, з першых дзён уборкі і возкі сена арганізаваць здачу сена дзяржаве, паставіўшы перад сабою задачу: першы пракос—дзяржаве. Забясьпечыць моцную бронь насеньнікаў канюшыны.

Увесь ураджай убраць бяз страт ва ўстаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны, распачаўшы ўборку па меры пасьпяваньня вучасткаў. Уборку азімых правесьці за пяць дзён, ячменю за 7 дзён, а астатніх яравых за 10 дзён, бульбы за 12 дзён і гароднины—10 дзён. Цалкам скарыстаць уборачныя машыны, даўшы ім максымальную нагрузку, забясьпечыўшы кожную жнярку зернеўлавіцелем.

Базвой праграмай устанаўляем: хлеб здаваць з першага абмалоту непасрэдна з'малатарні, арганізоўваючы для гэтага спэцыяльныя абозы з лепшых коняй і лепшых калгасьнікаў.

Азімыя культуры калгасы МТС абавязуюцца здаць у жніўні месяцы на працягу 5-ці дзён з пачатку іх абмалоту, яравыя—у жніўні на працягу 5 дзён з пачатку першай малацьбы, бульбу—у верасьні месяцы, пачаўшы першую здачу яе ў жніўні, здаючы бульбу непасрэдна з першай копкі, гародніну і ільновалакно здаць не пазьней 1 лістапада і датэрмінова выканаць здачу мяса і малака.

У кожным калгасе прапрацаваць пастанову ЦК і СНК ад 25 чэрвеня аб аплаце калгасам натурай за работу, утвараемую МТС па дагаворах з калгасамі. Прадстаўнікі калгасаў абавязаліся здаць МТС не пазьней 25 верасьня збож жавыя культуры за ўтвораныя работы і за абмалот па пяцідзёнках, а таксама бульбу і гародніну з першых дзён копкі і ўборкі.

Сяўбу азімых вызначана ўтвараць у адпаведнасьці з вызначаемымі севазваротамі. суцэльнымі масывамі; правёўшы дастатковыя асушыльныя работы. Асабліваю ўвагу савет зьвярнуў на пашыраньне сяўбы азімай пшаніцы і на радковую сяўбу. Савет пастанавіў 50 проц. пасеву азімых правесьці радковымі сявяркамі, пашырыўшы плошчу пасеву гатунковага жыта.

Савет пастанавіў зараз-жа прыступіць да рамонту і пабудовы бульбахавальняў, падрыхтоўкі тары (бочкі, чаны, скрыні, рамонт мяшкоў і інш.). Зяблівае ворыва вызначана зрабіць на ўсёй плошчы з-пад азімага жыта і яравых з разьлікам. каб у 1934 годзе веснавую сяўбу правесьці выключна па зяблівым ворыве.

Узятыя самаабавязацельствы МТС павінна выканаць, паказаўшы сапраўдныя прыклады ўдарнай работы.

ЛАЛО.

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

Камуніст на вёсцы — гэта вожык і арганізатар калгасных мас.

Актыўны ўдзел беспартыйных працоўных дапаможа партыі ўзмацніць свае ячэйкі, выгнаць з іх ворагаў, жулікаў і апартуністаў, узмацніць кіраўніцтва ўздымам сельскай гаспадаркі.

ВЫЯВІЦЬ І ВЫКРЫЦЬ ВІНОЎНІКАЎ ПРАРЫВУ.

Першы сход па чыстцы даўжанскай ячэйкі быў прызначан у 7 гадзін увечары. Але ў 8 гадз. 30 мін. сабралося толькі некалькі членаў і кандыдатаў партыі і група калгасьнікаў „Новы шлях". Гэта старшыня калгасу Багданаў Іван [illegible]цягнуў да чысткі партыі сваіх калгасьнікаў, каб яны дапамаглі камуністам у выкрыцьці хваробных зьявішчаў у рабоце партыйнай ячэйкі. З калгасьнікаў жа калгасу «Шлях Ільліча», у клюбе якога зьбіраецца сход, яшчэ нікога няма. Толькі а 9 й гадзіне пачалі прыбываць „першыя ластаўкі" з гэтага калгасу. Партыйцы Косаў і Крыўноў прыйшлі а 9 г. 30 мін., а сэкратар сельсавету партыец Ісак—нават у 9 г. 45 мін.

Калі стрэлка перашла на 11 гадзін, на сходзе было каля 50 калгасьнікаў. Партыйцаў Якубенка, Мехэвікова, Палякова, Корас, Верабейчыка яшчэ ня было. Праўда, Палякоў—старшыня калгасу „Інтэрнацыянал", прышоў к канцу сходу, а астатнія з пералічаных партыйцаў зусім ня прышлі.

Сход пачаўся. Пасьля ўступнага слова старшыні камісіі Ліцкевіча аб задачах і мэтах надыходзячай чыстки, слова атрымаў сэкратар ячэйкі Гарадзецкі. Сумна было слухаць яго даклад. Сумна не ад таго, што прамоўца нудна гаварыў, а ад таго, што яго справаздача была насычана абураючымі лічбамі, у дакладзе фігуравалі выключна процанты ніжэй 100:

— „Веспавую слэбу на сёньняшні дзень выканалі на 95,6 проц., а калгасы „Сілач" і „Інтэрнацыянал"—на 97. Закуплена хлеба замест 145 цэнт—16. Здачу мадака выканалі на 66 проц. Папар падняли на 23,3 проц. Праполка ідзе марудна",—канстатаваў сэкратар ячэйкі факты зрыву і правалу гаспадарча-палітычных заданьняў у сельсавеце, але на выкрыў тых перараджэнцаў з партбілетам у кішэні, якія прывялі сельсавет да прарыву. Ні слова не сказаў ён і аб тых захадах, якія ўжывала парт'ячэйка супроць кулацкіх разважаньняў членаў партыі накшталт Гудава. Ён зусім не закрануў пытаньняў аб спаборніцтве і ўдарніцтве, работы сельСТ, партыраўніцтве камсамолам і друкам.

Характэрна, што на запытаньні аб гэтым ён літаральна адказаў так: «камсамольцаў мы спрабавалі сабраць яшчэ ў пачатку, але мы не сабралі і на гэтым абмежаваліся; друкам мы займаліся адзін дзень; дагаворы па спаборніцтве былі заключаны, але выкананьне не кантраліравалі і сёньня мы ня можам сказаць аб паказчыках».

Сэкратар скончыў сваю справаздачу. Старшыня праверкома зварочваецца да сходу—хто жадае выказацца? Маўчаньне. Доўга «раскачваюцца» і вось—бярэ слова старшыня сельсавету,— за ім старшыня калгасу, старшыня сельСТ, упаўнаважаны гаркому партыі, загадчык пошты і ніводнага беспартыйнага калгасьніка. Чаму ня выступілі беспартыйныя калгасьнікі? Як потым высьветлілася, калгасьнікі баяцца выступаць. Вось Бояларав гаворыць: „У мяне многа дзяцей, баюся крытыкаваць, каб ня быць вычышчаным з калгасу". Гэта заява сьведчыць аб «мэтадах» кіраўніцтва і работы партыйнай ячэйкі.

У першы дзень праверылі двух членаў партыі—Багданава Івана—старшыню калгаса «Новы шлях» і Багданава Данілу—старшыню калгаса «Шлях Ільліча».

На апошнім многа застанавіліся. Камісіі ўдалося „разьвязаць языкі" калгасьнікаў, каб яны расказалі, як жа іх старшыня апраўдвае сабе як камуніст, як ён кіруе калгасам, ці ажыцьцяўляе м ё з в у н г зрабіць калгасьнікаў заможнымі, а калгасы—бальшавіцкімі. І вось тут высьветлілася, што Багданаў прыкарманьвае калгасныя грошы, робіць фальшывыя рахункі: мяшкі ён купляе ў сельСТ за 50 кап., а запрыходвае па 3 руб. Яе член сельсавету, атрымлівае грошы за падатак ад калгасьнікаў і адзіаасобнікаў і не здае ў сельсавет. Далей высьвятляецца, што гэты самы Багданаў, які крычыць на ўсіх сходах за мерапрыемствы партыі і савецкай улады, мае сувязь з кулаком Куляшовым, выдае яму бульбу, дае яму калгаснага каня апрацаваць гарод. І ясна становіцца, чаму калгас увесь час знаходзіцца ў прарыве.

Сход скончыўся ў палове 2-й гадзіны. Гэты першы крок чыстки вясковых ячэек гаворыць аб тым, што калгасныя масы яшчэ ня прыцягнуты, не мабілізаваны на актыўны ўдзел па чыстцы. Урокі павінны быць улічаны і недахопы павінны быць адразу выпраўлены.

І. Казанскі.

АБ ВЫНІКАХ СХОДУ ПРАПАГАНДЫСТАЎ.

Пастанова Віцебскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б ад 1 ліпеня 1933 году.

Прызнаць зусім дрэннай пастаноўку палітычна-выхаваўчай працы сярод членаў партыі ў віцебскай партарганізацыі. Даручыць бюро віцебскага ГК КП(б)Б абгаварыць гэтае пытаньне і прыняць рад канкрэтных мерапрыемстваў.

Даручыць ячэйковым праверкомам, правяраючы членаў партыі-прапагандыстаў, высьветліць іх дзейнасьць у гэтым напрамку і вынікі іх прапагандысцкай работы.

АД ГАРАДЗКОЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

Абвяшчаюцца дні паседжаньняў гарадзкой камісіі па зацьвярджэньні вынікаў і разгляду апэляцый на рашэньні ячэйковых праверкомаў.

Гарадзкая камісія засядае штодзённа з 11 гадзін дня:

5 ліпеня—ячэйка фабрыкі гнутай мэблі, Дарбудвуч, электрамэханічны рабфак.

6 ліпеня—банк, голкавая фабрыка.

7 ліпеня—біафабрыка, даўжанская і мікалаёўская ячэйкі.

Гарадзкая камісія па чыстцы.

ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА НА ФАБРЫЦЫ „ДЗЬВІНА".

1 ліпеня пачалася чыстка парткалектыву фабрыкі „Дзьвіна".

На першым сходзе прысутнічала 143 камуністы, 84 камсамольцы і 465 беспартыйных рабочых. Сход быў прызначаны на 7 гадзін, а пачаўся а 8 й гадзіне. Несвачасовая яўка камуністаў і работнікаў калектыву на сход гаворыць аб недысцыплінаванасьці членаў партыі і недастатковай мабілізацыі беспартыйных рабочых.

Адкрываючы сход, старшыня камісіі па чыстцы т. Прудніка́ў кароткa, але чотка і выразна ахарактарызаваў задачы чысткі партыі і асаблівасьці чысткі 1933 году ў параўнаньні з мінулымі чысткамі. Пасьля інфармацыі праверкому з дакладам аб рабоце парткалектыву выступіў сэкратар калектыву т. Вэксьлер, які ў сваім дакладзе застанавіўся на прарыве ў выкананьні фабрыкай прамфінпляну, але гэтаму прарыву т Вэксьлер ня даў патрэбнага аналізу, не паказаў шляхоў, якімі партыйная арганізацыя змагалася за выкананьне пляну. У дакладзе сэкратара калектыву амаль што ня было закранута пытаньне шэфства над вёскай, кіраўніцтва камсамолам, работа з кандыдатамі і аб прыгаданай гаспадарцы. Тав. Вэксьлер ні слова не сказаў аб 150 камуністах, якіх „згубіла" партарганізацыя фабрыкі.

Пасьля сэкратара парткалектыву з дакладам аб рабоце цэхавай ячэйкі выступіў сэкратар рамонтнай ячэйкі т Рашчынскі з садакладам самаправераччнай брыгады, якая адзначыла, што ў цэху ніякай работы з партыйцамі не вялося; партыйцы-ўдарнікі ў цэху не адчуваюцца, як яны апраўдваюць званьне ўдарніка,—вучоту ніякага няма. Мала было праведзена масавай работы ў цэху, кандыдат партыі Кастырскі зусім ня ведаў аб чыстцы партыі да пачатку работы самаправераччнай брыгады.

Выступаючы ў спрэчках, камуністы фабрыкі адзначылі недастатковую работу парткалектыву з кандыдатамі. Кандыдат партыі Панічава ў сваім выступленьні адзначыла, што з ёю на працягу 7-мі месяцаў прабываньня ў кандыдатах ніякай работы не вялося. Работніца Нікіфорава скардзілася, што з боку парткалектыву ня было ніякай увагі шэфтаварыству.

Пасьля спрэчак пачалася чыстка ячэйкі рамонтнага цэху.

Севасьцеенка.

Ня рыхтуюцца да чысткі.

Пачалася ўжо чыстка вясковых арганізацый, а партыйная ячэйка калгасу „Тулава", на чале з сэкратаром тав. Цялопам, бязьдзейнічае і не разгарнула да гэтага часу належнай падрыхтоўчай работы да чысткі. Да гэтага часу не праведзены ніводны сход, ніводная гутарка сярод рабочых калгасу.

А.

АГЛЯД ДРУКУ.

У РОЛІ ЗАЖЫМШЧЫКАЎ САМАКРЫТЫКІ.

Шматтыражка „Лекертавец"— орган бюро парткалектыву, калектыву ЛКСМБ і фабкому фабрыкі імя Лекерта.

„Ня гледзячы на ПАСТАНОВУ бюро парткалектыву—на сёньнешні дзень рэагаваньня на заметкі, зьмешчаныя ў штодзёнках і шматтыражцы „Лекертавец"—няма"

так пісала на сваіх старонках шматтыражка «Лекертавец» 3-га студзеня 1933 году.

„Ня гледзячы на РАД ПАСТАНОЎ бюро парткалектыву аб канкрэтным (!—рэд.) і своечасовым (!—рэд.) рэагаваньні на зьмяшчаемыя як у шматтыражцы, так і штодзёнках заметкі, мы маем з боку парткалектыву і прафарганізацыі, а таксама і адміністрацыі поўнае ігнараваньне",—

паўторна заявіла шматтыражка «Лекертавец» 16 красавіка г. г.

„Рэдкалегія шматтыражкі НЕАДНАРАЗОВА ПІСАЛА на сваіх старонках, што фабрычныя арганізацыі ЗУСІМ НЕ РЭАГУЮЦЬ на допісы, зьмяшчаемыя як у „Лекертаўцы", так і ў штодзёнках, чым дапускаюць грубейшы заціск самакрытыкі.

УСЕ ФАБРЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, у тым ліку і парткалектыў на працягу трох месяцаў не рэагуюць ні на адзін допіс ня гледзячы на прыняты рэдкалегіяй мэтад рассылкі выразак з газэт для рэагаваньня",—

выступіла ў трэці раз шматтыражка «Лекертавец» 11 мая.

Тры выступленьні праз друк, тры скаргі НА ЎСЕ арганізацыі фабрыкі і ніводнага канкрэтнага прозьвішча, ніводнага канкрэтнага зажымшчыка самакрытыкі газэта не прывяла ды і крыўду газэты на фабрыцы ніхто не заўважыў.

12 чэрвеня, нарэшце, бюро парткалектыву вынесла чарговую пастанову наступнага зьместу:

„Бюро парткалектыву папярэджвае ЎСІХ сэкратароў парт'ячэек і старшынь цэхкомаў, што становішча з рэагаваньнем на фабрыцы нездавальняючае, і гэта зьяўляецца прамым заціскам самакрытыкі. Папярэдзіць сэкратароў парт'ячэек і старшынь цэхкамітэтаў, што калі з іх боку ня будзе своечасовага і чоткага рэагаваньня і аказаньня канкрэтнай дапамогі і кіраўніцтва ў працы штодзёнак да іх будуць прыняты адпаведныя меры партспагнаньня".

Як і шматтыражка «Лекертавец», так і бюро парткалектыву ЎСІХ папярэджваючы, УСІМ напамінаючы, лічуць (і зусім правільна), што нерэагаваньне на заметкі ёсьць заціск самакрытыкі, але ні бюро парткалектыву фабрыкі імя Лекерта, ні яго органа—шматтыражка «Лекертавец» НЕ ЖАДАЮЦЬ знайсьці вінаўнікаў грубага заціску самакрытыкі. Яны толькі фіксуюць, канстатуюць, патрабуюць... І усё гэта на паперы.

Канстатуючы заціск самакрытыкі на фабрыцы, бюро парткалектыву, не заўважаючы гэтага, выступае ў ролі зажымшчыка. Прыводзім характэрны факт.

На фабрыцы ідзе чыстка партыйных радоў, да якой павінна быць прыкавана ўвага ўсяго рабочага калектыву У вінтавым цэху два дні падрад—23 і 24 чэрвеня зрываюцца выпушчаныя нумары цэхавой штодзёнкі, у якіх выкрываліся прымазаўшыяся да партыі людзі, якіх патрэбна выгнаць з яе радоў. Факт абураючы, факт, які сыгналізуе, што, выражаючыся мовай «Лекертаўца», «нягледзячы на рад пастаноў»—клясавы вораг на фабрыцы арудуе. Сыгнал, патрабуючы ўзьняцьця ўсёй грамадзкасьці фабрыкі, каб выкрыць і вышыбіць з фабрыкі шкоднікаў. Але нікога гэта ня турбуе. Кіраўнікі арганізацый па-ранейшаму спакойны.

Нягледзячы на тое, што рэдкалегія штодзёнкі заявіла аб гэтым і сэкратару парткалектыву тав. ЛЕВІНУ, і старшыні фабкому т. ХАЦЯНАВУ, і рэдактару шматтыражкі т КРЭНДЗЕЛЮ, апошнія засталіся глухімі.

А пасьля таго, як рэдкалегія штодзёнкі ацаніла зрыў двох нумароў газэт як выдазку клясавага ворага і выпусьціла спэцыяльны бюлетэнь, заклікаючы рабочых да клясавай пільнасьці, сэкратар парткалектыву т. Левін і старшыня фабкому т Хацянаў спрабуюць даказаць, што нічога тут шкоднага няма і што «рабочыя сарвалі газэты для таго, каб завярнуць у іх клёцкі». Трэба страціць усялякае клясавае пачуцьцё, быць настолькі палітычна сьляпым, каб дадумацца да гэтага.

Паўтараем: на фабрыцы груба заціскаецца крытыка і самакрытыка. Сыгналы, якія падаюць рабочыя ў шматтыражку «Лекертавец», рэдкалегія ня ўзьнімае на прынцыповую вышыню. Рэдкалегія не разумее, што ліст ёсьць сыгнал (а калі разумее і ня робіць,—дык тым горш для яе) і што на гэты сыгнал трэба хутка і па бальшавіцку рэагаваць. У газэце няма «аддзелу лістоў рабочых», няма аддзелу і «па сьлядох лістоў». Зьмясьціўшы за 6 апошніх месяцаў сотні допісаў рабочых, газэта толькі тры разы—10 лютага, 11 сакавіка і 26 красавіка адважылася зьмясьціць некалькі адпісак у аддзеле «Нам адказваюць».

Бюро парткалектыву не рэагавала на зьмяшчаемыя допісы, а як рэагуе фабком на рабкораўскія допісы можна судзіць па тым, што з пачатку гэтага году было рэагавана толькі на 7 заметак (ды і то два разы гэта зрабіла газэта „Віцебскі пралетары", два — газэта «Легкая индустрия» і толькі 3 адказы зьмешчаны ў шматтыражцы „Лекертавец").

Але грош цана і гэтаму „рэагаваньню". «Віцебскі пралетары» зьмясьціў ліст рабочага абутковай фабрыкі пад загалоўкам «Выгнаць Баскіну з сацыялістычнай фабрыкі». Фабком, разабраўшы заметку, пастанавіў:

„Гэта заметка не ВА ЎСІМ падцьвярджаецца. Падцьвярджаецца яна толькі ў некаторых частках. Тое што яна брала на свой кошт адпачынак і езьдзіла ў Менск гэта ПАДЦЬВЯРДЖАЕЦЦА, АЛЕ нам НЕВЯДОМА чаму яна туды езьдзіла: спэкуляваць альбо не; тое што яна бярэ частыя бюлецені-бюлецені яна атрымлівае, але ці спэкулюе яна ў гэты час НАМ НЕВЯДОМА. Тое што яна зьяўляецца чужым элемэнтам НАМ НЕВЯДОМА.. Падцьвярдзілася тое, што яна ДРЭННА АДНОСІЦЦА да працы, у цэху ЗЬБІРАЕ ГРУПОЎКІ РАБОЧЫХ вакол сябе, у час працы разносіць розныя разважаньні. Таму фабком пастанаўляе, што калі тав Баскіна надалей будзе так весьці сябе на вытворчасьці то яе зьнімуць з працы і яна будзе выключана з радоў прафсаюзу".

Характэрная рыса ў рабоце кіраўніцтва прафсаюзнай арганізацыяй фабрыкі тое, што яна НІЧОГА НЯ ВЕДАЕ І ВЕДАЦЬ НЕ ЖАДАЕ. Нават даведаўшыся, што Баскіна дрэнна адносіцца да працы», што яна ў цэху зьбірае групоўкі рабочых і робіць контрэвалюцыйныя справы, фабком, страціўшы рэвалюцыйную пільнасьць, выносіць яўна прымірэнчую да клясавага ворага пастанову, якая абаранае яго. Так фабком адносіцца да лістоў рабочых, так ён выконвае паказаньні тав. Кагановіча!

Пасьля прыведзеных намі фактаў, наўрад ці варта што дабаўляць. Трэба зрабіць вывад. А вывад павінен быць моцны. Рэдактар шматтыражкі Крэндзель, сэкратар парткалектыву Левін і старшыня фабкому Хацянаў не на сваім месцы. І мы ўпэўнены, што гарком партыі і гарпрафсавет адносна іх скажуць свае слова і ацэняць іх «работу», якая прывяла да таго становішча, што на фабрыцы заціскаецца крытыка і самакрытыка, што на фабрыцы ні газэта, ні партыйна-прафсаюзныя арганізацыі не вядуць работы з лістом рабочага.

ЕМ. ЯРАСЛАЎСКІ.

Арганізацыйныя прынцыпы бальшавізму *).

III. Аб партыйнай дысцыпліне.

Якія былі арганізацыйныя асновы, на якіх будавалася наша партыя? Тут трэба перш за ўсё падкрэсьліць пытаньне аб партыйнай дысцыпліне. У перыяд падпольнай барацьбы дысцыпліна мае выключна агрэсіўнае значэньне. Людзей, што не падпарадкоўваліся партыйнай дысцыпліне, мы выключалі з партыі, нягледзячы на тое, што часам у іх былі вялікія заслугі. У перыяд, калі мы рыхтаваліся да ўзброенага паўстаньня, Левін настойваў на выключэньні з партыі Зіноўева і Каменева, як штрэйкбрэхераў, іменна таму, што яны парушылі партыйную дысцыпліну і выступілі супроць паўстаньня партыі аб паўстаньні ў «Новой жизни», якая была органам поўменшавіцкай арганізацыі, змагаўшайся тады супроць нас.

Праз два з паловай гады пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі Левін пісаў:

«Напэўна цяпер ужо амаль усялякі бачыць, што бальшавікі не пратрымаліся-б ва ўладзе ня тое, што два з паловай гады, але і два з паловай месяцы без жорсткай, сапраўды жалезнай дысцыпліны ў нашай партыі, без самага поўнага і беззаветнага падтрыманьня яе ўсёй масай рабочай клясы, г. зн. усім, што ёсьць у ёй мысьлячага, чэснага, самаадданага, уплывовага, здольнага весьці за сабою ці захапляць адсталыя пласты».

Чаму патрэбна гэтая дысцыпліна? Левін гаварыў:

«Дыктатура пралетарыяту ёсьць упартая барацьба, крывавая і бяскроўная, гвалтоўная і мірная, ваенная і гаспадарчая, педагагічная і адміністратарская супроць сіл і традыцый старога грамадзтва. Сіла прызвычаенасьці мільёнаў і дзесяткаў мільёнаў—самая страшная сіла. Без партыі, жалезнай і загартаванай у барацьбе, без партыі, карыстаючайся даверрам усяго сумленнага ў данай клясе, без партыі, умеючай сачыць за настроем мас і ўплываць на яго, весьці пасьпяхова такую барацьбу немагчыма».

Чым жа трымаецца дысцыпліна рэвалюцыйнай партыі пралетарыяту, чым яна падмацоўваецца? Левін адказвае: па-першае, сьвядомасьцю пралетарскага авангарду, яго адданасьцю рэвалюцыі, яго вытрымкай, самаадданасьцю, гераізмам. Таму, калі пытаньне ідзе аб партыйнай дысцыпліне, дык кожны партыец павінен сябе з гэтага боку праверыць: як на самай справе ён правяў сьвядомасьць пралетарскага авангарду, у чым ён правяў адданасьць рэвалюцыі, у чым правявілася яго вытрымванасьць, самаадданасьць, гераізм. Кожны сёньняшні дзень патрабуе найвялікшага гераізму і сёньня для гэтага найвялікшага гераізму ёсьць месца, і сёньня прыходзіцца паказваць узоры самаадданасьці, самаахвяраваньня, і сёньня прыходзіцца паказваць узоры найвялікшай сьвядомасьці таму, хто змагаецца за сацыялістычнае будаўніцтва, па-сапраўднаму, па-бальшавіцку.

«Па другое,—кажа Левін,—гэта дысцыпліна рэвалюцыйнай партыі пралетарыяту правяраецца і падмацоўваецца яго ўменьнем зьвязвацца, зблізіцца, да пэўнай ступені, калі хочаце, зьліцца з самай шырокай масай працоўных і ў першую галаву, з пралетарскай масай, але таксама з непралетарскай працоўнай масай».

Значыцца, кожны бальшавік павінен правяраць сваю дысцыплінаванасьць, адданасьць партыі яшчэ і тым, наколькі ён зьвязаны з масамі. Бо ў нас ёсьць у партыі людзі, якія адарваліся ад мас.

У нас быў такі цяжкі момант, калі ў 1918—1920 гг. у Маскве было неймаверна голадна, чвэртку хлеба і тое ня кожны дзень мы маглі забясьпечыць. Мы тады арганізоўвалі масавыя мітынгі і ў гэты момант мы ішлі на заводы ў рабочыя масы. У часе аднаго з такіх мітынгаў эсэры нават спрабавалі забіць уладзімера Ільліча. Мы ішлі к масам у самыя трудныя мінуты. І іменна таму, што мы былі зьвязаны з масамі, мы маглі іх весьці за сабою. Таму сувязь з масамі патрабуецца ад кожнага бальшавіка.

Чыста бывае так: бальшавік едзе ў вагоне трамваю, ці чыгуначнай дарогі, ці стаіць у чарзе і каля яго вядзецца контрэвалюцыйная размова. Ён маўчыць, думае: лепш ужо я ўвязвацца ня буду, так супакойней. Нікуды ня варты такі бальшавік. Бальшавік той, хто ўмее нават і супроць аграмаднай масы настроеных няправільна людзей пайсьці і сказаць ім сваё слова, пераконваць іх і пераканаць. Такое загартаваньне трэба выхоўваць у кожным бальшавіку.

Па трэцяе,—гаварыў Левін,—дысцыпліна авангарду падмацоўваецца і правяраецца «правільнасьцю палітычнага кіраўніцтва, што ажыцьцяўляецца гэтым авангардам, правільнасьцю яго палітычнай стратэгіі і тактыкі, пры ўмове, каб самыя шырокія масы сваім уласным вопытам пераканаліся ў гэтай правільнасьці».

Левін казаў, што без гэтага правіла, без гэтых умоў спробы стварыць дысцыпліну абарачваюцца ў пустышку, у гразнае крыўляньне.

X зьезд партыі ў 1921 годзе прыняў рэзалюцыю аб адзінстве партыі, у якой гаворыцца, што можна і трэба выключаць за фракцыйную барацьбу, за парушэньне партыйнай і савецкай дысцыпліны ня толькі радавых членаў партыі, але можна, не чакаючы зьезду, выключаць са складу ЦК і нават з партыі членаў ЦК. Зьезд партыі—ёсьць вышэйшы орган, ён выбірае Цэнтральны камітэт, наступны зьезд можа пераабраць ці не пераабраць таго ці іншага члена ЦК. Але калі член ЦК парушыў партыйную дысцыпліну,—гаварыў Левін,—то няма зачым чакаць наступнага зьезду, трэба сабраць членаў ЦК і ЦКК і двума трэцямі галасоў выключыць яго са складу ЦК і нават з партыі. Гэты пункт рэзалюцыі X зьезду кажа:

«Каб ажыцьцявіць строгую дысцыпліну ўнутры партыі і ва ўсёй савецкай рабоце і дамагчыся найбольшага адзінства пры зьнішчэньні ўсялякай фракцыйнасьці, зьезд дае ЦК поўнамоцтвы дапасоўваць у выпадку (-ах) парушэньня дысцыпліны і адражэньня ці дапушчэньня фракцыйнасьці ўсе меры партыйных спагнаньняў, аж да выключэньня з партыі, а ў адносінах да членаў ЦК перавод іх у кандыдаты і нават як крайнюю меру—выключэньне з партыі. Умовай дастасаваньня (да членаў ЦК, кандыдатаў ЦК і членаў кантрольнай камісіі) такой крайняй меры павінна быць склікаьне пленуму ЦК з запрашэньнем усіх членаў кантрольнай камісіі Калі такі агульны сход найбольш адказных кіраўнікоў партыі ²/₃ галасоў прызнае неабходным перавод члена ЦК у кандыдаты ці выключэньне з партыі, дык такая мера павінна быць ажыцьцяўлёна безадкладна».

На падставе гэтай пастановы X зьезду, мы неаднакроць выключалі са складу ЦК парушыцеляў партыйнай дысцыпліны і адзінства нашай партыі. Гэта ж думка замацавана і ў статуце нашай партыі ў пункце «Аб партыйнай дысцыпліне».

«Стражайшая партыйная дысцыпліна зьяўляецца пярвейшым абавязкам усіх членаў партыі і ўсіх партыйных арганізацый. Пастанова партыйных цэнтраў павінна выконвацца хутка і дакладна. Разам з тым, унутры партыі абгаварэньне ўсіх спрэчных пытаньняў партыйнага жыцьця зусім свабодна да таго часу, пакуль рашэньне ня прынята.

Невыкананьне пастаноў вышэйшых арганізацый і другія ўчынкі, прызнаваемыя злачыннымі грамадзкай думкай партыі, цягнуць за сабою: для арганізацыі—ганьбу, прызначэньне часовага камітэту зьверху і агульную перарэгістрацыю (роспуск арганізацыі); для паасобных членаў партыі—той ці другі від ганьбы (пастаноўка на від, вымова і г. д), публічнае ганьбаваньне, часовае адсуваньне ад адказнай партыйнай і савецкай работы, выключэньне з партыі, з паведамленьнем аб учынку адміністрацыйным ці судовым уладам».

Статут нашай партыі дапускае самыя рознастайныя партыйныя спагнаньні ў дачыненьні да членаў партыі. Чаму? Таму, што можа быць розная ступень віны, розныя меры партыйнага выхаваньня і партыйных рэпрэсій. Аднак, партыя ва ўсёй рашучасьцю патрабуе гэтай жалезнай партыйнай дысцыпліны, як умовы нашай барацьбы Без гэтай жалезнай партыйнай дысцыпліны партыя ня мысьліць пасьпяховую барацьбу за сацыялізм.

Барацьба за адзінства партыі патрабуе самай рашучай барацьбы супроць усякага роду ідэалягічных ухілаў, супроць фракцый і групавак Само сабой зразумела, што барацьба з ідэалягічнымі ўхіламі патрабуе поўнага ўзроўню ведаў тэорыі, уменьня разабрацца ў рознага роду выступленьнях, уменьня адрозьніваць: дзе—правільная абарона партыі, дзе—памылка таварыша, якая ёсьць вынік яго няўменьня правільна выражаць думкі, правільна разабрацца, а дзе ўхіл, г. зн. абарона чуждага пралетарыяту, чуждага нашай партыі пункту гледжаньня.

Партыя наша расла і мацнела ў барацьбе з ухіламі. Левін нават так наймецаваў адзін з разьдзелаў сваёй выдатнай работы «Детская болезнь левизны»: «У барацьбе з якімі ворагамі ўнутры рабочага руху вырас, умацаваўся і загартаваўся бальшавізм» (том 25, стар. 179—186).

У гэтым разьдзеле ён кажа аб барацьбе на 2 франты, супроць апартуністаў справа і супроць дробнабуржуазнай рэвалюцыйнасьці „зьлева".

Барацьба за адзінства партыі патрабуе самага рашучага адпору ўсялякім спробам прымірэнчых адносін да ўхілаў, яна патрабуе адрозьніваць—які ўхіл у даны момант зьяўляецца найбольш небясьпечным Гэта барацьба павінна весьціся ня толькі ў тэорыі. Трэба біць моцна па апартунізьме ў практыцы. Іншы на словах клянецца ў вернасьці партыі, а на справе—апартуніст з апартуністаў.

Трэба змагацца рашуча супроць усякай групоўкі, супроць усякіх спроб абгаварваць спрэчныя пытаньні не ў партыйным коле, не на партыйных сходах, не ў партыйным друку,—ва ўстаноўленым партыяй парадку, а ў сваёй групе, якая лёгка ператвараецца ў пастаянную групоўку і зьяўляецца крокам да стварэньня фракцый.

*) Працяг. Гл. №№ 149 і 150 „В. П.".

За граніцай.

Германскі ўрад дае субсыдыі румынскім фашыстам.

ВЕНА. У румынскіх палітычных колах выклікала вялікую сэнсацыю выступленьне міністра ўнутраных спраў Пэтрэ Андрэй на канфэрэнцыі нацыянал-царанісцкай партыі ў Ясах з выкрыцьцём крывіц фінансаваньня румынскіх фашысцкіх груповак. Пэтрэ Андрэй абвінавачваў фашысцкую «жалезную гвардыю» — антысэміцкую Лігу «хрысьціянска нацыянальнай абароны», якая ўзначальваецца прафэсарам Куза, і іншыя правыя арганізацыі ў тым, што яны атрымоўваюць субсыдыі ад германскага ўраду.

ВЕНА Згодна паведамленьня бэсарабскіх газэт, у Бэсарабіі за апошні час зьявіліся агенты германскі" нацыянал-сацыялістаў, якія вядуць дэмагагічную антысэміцкую агітацыю пад кіраўніцтвам чорнасоценца Татарэску. Агітацыя ўзмоцнена вядзецца сярод немцаў калёністаў.

«Бессарабское слово» ўказвае, што дзьве нацыянал-сацыялісцкія газэты, якія выходзяць у Кішыневе: «Воскресенье» і „Бессарабский телеграф" атрымоўваюць субсыдыі ад германскага віцэ-консула ў Кішыневе Гірша. Газэта патрабуе неадкладнай высылкі Гірша.

Перад працэсам аб падпале рэйхстагу.

ЛЁНДАН. Прыбыў антыфашыстскі дзеяч Отто Каз. Ён паведаміў, што ў бліжэйшы час будзе апублікавана „карычневая кніга аб гітлераўскім тэроры" праф Эйнштэйна, выданая міжнародным камітэтам. Адначасова з Лейпцыгскім працэсам па справе аб падпале рэйхстагу ў Галяндыі будуць агалошаны ўсе факты, зьвязаныя з падпалам. У Гаазе будзе засядаць камісія з 9 юрыстаў Англіі, ПАЗШ, Францыі, Галяндыі, Швэцыі, Даніі, Швэйцарыі і Гішпаніі, якая будзе разглядаць паказаньні, даваемыя на Лейпцыгскім працэсе, а таксама даныя, прадстаўленыя міжнародным камітэтам.

„Германскі фашызм даны ад бога".

Ватыкан падтрымлівае антысавецкія пляны Розэнбэрга.

РЫМ. Сёньня пачаліся перагаворы фон Папэна з Ватыканам па пытаньні аб заключэньні агульнагерманскага канкардату. Перагаворы ўрупяцца вакол пытаньня аб умовах ліквідацыі германскай каталіцкай партыі цэнтру. У рымскіх палітычных колах лічаць мала праўдападобным канфлікт паміж Ватыканам і германскім фашызмам па повадзе адносін апошняга да партыі цэнтру.

Больш таго, каталіцкі друк апублікаваў зварот германскіх епіскапаў, у якім указана, што германскі фашызм «даны ад бога». У палітычных колах указваюць, што Ватыкан актыўна падтрымлівае пляны Розэнбэрга, аказваючы фінансавую дапамогу антысавецкім групам.

АБ ВЫРАБЕ І ГАНДЛІ МАРОЖАНЫМ.

Абавязковая пастанова № 11|27 віцебскага гарсавету.

У мэтах барацьбы са страўнікава-кішэчнымі хваробамі, Віцебскі гарадзкі савет п а с т а н а ў л я е:

1. Адчыненьне прадпрыемстваў па вырабе і гандлі марожаным вытвараецца з дазволу санітарнай інспэкцыі пасьля папярэдняга агляду прыгоднасьці памяшканьняў у санітарных адносінах.

2. Памяшканьні павінны быць абсталяваны па ўказаньні саннагляду і заўсёды трымацца ў чыстаце.

3. Прадукты, з якіх робіцца марожанае, а таксама само марожанае, павінны быць сьвежымі і добраякаснымі. Забараняецца трымаць марожанае ў банках больш як адны суткі. Для замараваньня неабходна карыстацца чыстым ільдом.

УВАГА. Лёднік павінен знаходзіцца на адлегласьці ня менш 10 мэтраў ад прыбіральняў і памыйных ям і павінен адцавядаць свайму прызначэньню.

4. Пры вырабе марожанага забараняецца ўжываньне сахарыну і камянявугальных фарбаў.

5. Медзяныя бакі, у якіх трымаецца марожанае, павінны быць палужаны волавам і заўсёды быць чыстымі.

6. Асобы, якія займаюцца вырабам і гандлем марожаным, павінны быць у чыстых белых халатах і мець на руках зьёмныя абшлагі з непрамякальнага матэрыялу. Жанчыны павінны мець на галаве белую хустку ці касынку.

7. Начыньне, у якой даецца марожанае, павінна быць чыстае і папярэдня павінна прапалясквацца чыстай вадой і выціірацца чыстым рушніком.

8. Асобы, якія заняты ў азначаных прадпрыемствах, павінны мець даведкі аб медычным агляде, якія штомесячна аднаўляюцца, прычым асобы, што перпяць на актыўную форму тубэркулёзу і іншыя заразныя хваробы, да работы па вырабе і продажы марожанага не дапускаюцца.

9. Прадпрыемствы павінны быць забясьпечаны ўмывальнікам, мылам і рушніком.

10. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на саннагляд і міліцыю.

11. Асобы, вінаватыя ў невыкананьні гэтай абавязковай пастановы, прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб. або прымусовым работам да 15 дзён.

12. Гэтая абавязковая пастанова набывае моц праз 5 дзён пасьля яе апублікаваньня.

Старшыня гарсавету Кардашэнка.

За сэкратара Мікіціч.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ.

— Сёньня, а 6 гадзіне ўвечары, у Доме камасветы для выкладчыкаў грамадзкіх дысцыплін ВНУ, ВТНУ, тэхнікумаў і рабфакаў будзе прачытана лекцыя на тэму: „Ленінскі этап філёзофіі і барацьба на два франты". Лектар т. Краўчук.

Запрашаюцца прапагандысты і кіруючы партактыў.

Культпроп ГК КП(б)Б.

Праполка і падрыхтоўка да ўборкі ў каапгасах.

Сталая брыгада рабочых-камсамольцаў імя чысткі партыі з фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі" паказвае узор барацьбы за высокі ўраджай.

УДАРНАЯ БРЫГАДА СЯБЕ АПРАЎДАЛА.

Калі стала вядома, што на прапольцы ў каапгасе „Новы шлях"—прарыў, камсамольскі калектыў фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» вырашыў паслаць сталую вытворчую брыгаду з 35 лепшых камсамольцаў.

Брыгада пачала працаваць з 22 чэрвеня. Яна сябе цалкам апраўдала, паказаўшы ўдарныя ўзоры барацьбы з пустазельлем. Заданьне па прапольцы брыгада штодзённа перавыконвала. Кожны выпрацоўваў па 140—150 пагонных мэтраў. Кожны ў брыгадзе быў абсоплен індывідуальным сацспаборніцтвам.

Пасьля працы кожны дзень у вас вытворчая нарада. На нарадзе мы абмяркоўваем вынікі работы за дзень, намячаем мерапрыемствы па зьніщэньні маючыхся недахопаў і г. д.

У барацьбе за выкананьне норм выпрацоўкі заваявалі назву лепшых ударнікаў тт: Бараўчанка, Круглянская, Ліўшыц, Палякова, Лапавухава, Вінаградава і Колкава, якія даюць адначасна з колькасьцю і добрую якасьць. Гэтыя камсамольцы выклікалі на сацспаборніцтва і прад'явілі рахунак адстаючым у брыгадзе Пахучэўскай і Жалязьняк. Яшчэ 27 чэрвеня, а 5 гадзіне ўвечары брыгада скончыла першую прапольку.

У гонар чысткі партыі, разумеючы сваю вялікую адказнасьць па барацьбе зэ ўраджай гародніны, наша брыгада ўзяла сабе назву імя чысткі партыі 28 чэрвеня на адкрытым партсходзе фабрыкі мы рапартавалі т Жоброўскаму—сэкратару ЦК КП(б)Б і старшыні гаркамісіі па чыстцы, а таксама партыйнаму сходу аб скančэньні першай прапольці і запэўнілі іх, што з яшчэ большым энтузыязмам возьмемся за другую прапольку і правядзем яе добраякасна і хутка.

Ад імя брыгады Каган.

Рагожны сьцяг у каапгасе «Дзьвіны».

На паперы ёсьць сталая брыгада, а на справе няма.

Дзьвінцы, набірайце тэмпы, каб пазбавіцца сьцягу ганьбы.

Другі раз рагожны сьцяг у каапгасе „МОПР" толькі таму, што трыкутнік фабрыкі «Дзьвіна» (дырэктар Баплан, сэкратар калектыву Вэксьлер, старшыня фабкому Собалева) пасьля скančэньня слябы апартуністычна самазаспакоіўся і зусім забыў аб неадкладнай пасылцы пастаяннай брыгады ў гаспадарку з фабрыкі. Праўда, фармальна была вылучана сталая брыгада ФЗВ, але яна прапрацавала яны-не толькі тры дні і «змылася». Праўда і тое, што пэўныя культуры гародніны фармальна замаравазны за пэўнымі цэхамі, але рабочыя фабрыкі пра гэта ня ведаюць. Ды як і ведаць. Калі часамі з пэху, дзе сотні рабочых, для прапольці сваёй культуры фабком пасылае 2—3 чал. і то па выходных днёх. Вось як ураўзумелі фабкомаўцы важнасьць прапольці.

Дачакаўшыся пастановы гарпрафсавету аб рагожным сьцягу, фабком кідаецца ў другі бок: пасылае 1 і 2 чэрвеня па 500—700 чал. Ясна, што з гэтага вышла: на фабрыцы ў гэты дзень нічога не рабілі і ў гаспадарцы мала барысьці далі.

Каапгас можа праз дзень—два пазбавіцца рагожнага сьцягу, але для гэтага патрэбны з боку фабкому і дырэкцыі каапгасу, як ніколі, вялікія намаганьні.

Трэба адзначыць, што дырэктар каапгасу камуніст Шыльнікаў адмаўляўся ваватсклікаць сход у сувязі з уручэньнем рагожнага сьцягу. Ён ня хоча бачыць у гаспадарцы агідных зьявішчаў, не жадае мабілізоўваць увесь рабочы калектыў каапгасу на пасьпяховае завяршэньне прапольці і балвой падрыхтоўкі да ўборкі. На гэтыя антыпартыйныя паводзіны дырэктара Шыльнікава трэба хутка рэагаваць.

Азаронак.

Кіраўнікі фабрыкі імя Лекерта не арганізавалі яшчэ сталай брыгады.

У час пасеўнай кампаніі каапгас фабрыкі імя Лекерта за ганебныя тэмпы сяўбы быў занесены на чорную дошку. Рабочыя фабрыкі, не жадаючы мірыцца з гэтай ганьбой, мабілізаваліся на ліквідацыю прарыва. Брыгада імя гарсавету прававала на пасеўнай і прышла зноў на чатыры дні, каб дапамагчы ў прапольцы. Але старшыня цэхкому закройнага цэха Гальбрайх, сэкратар пэхячэйкі Дэйч, рэдактар штодзённі Ром замест таго, каб арганізаваць работу, належна расставіць сілы—прыяжджаюць ў абедзены перапынак, каб толькі прайсьціся ў сьвяточным адзеньні па полі Гальбрайх нават прыяжджаў в жонкай і дзецьмі, пасьля чаго, пазбедаўшы, зноў ад'яжджалі ў горад.

24 чэрвеня на прапольку было мабілізавана 68 чалавек і толькі пасьля работы мы ўбачылі, што ў каапгас ідуць Гальбрэйх і Дэйч. Што ж яны тут рабілі? Ні мала, ні многа—пад'ехалі ў сталоўцы ды зноў навіраваліся ў горад і на другі дзень ужо зусім не паказаліся.

Дагавор паміж каапгасам і фабрыкай яшчэ ня складзены. Цэхі фабрыкі не прымацаваны да асобных культур у каапгасе.

Трэба, нарэшце, зразумець, што сталая вытворчая брыгада—вырашае посьпех як прапольці, так і ўборчай кампаніі. Таму наш каапгас павінен мець сталую брыгаду, склад якой павінен зьмяняцца па дзесяцідзёнках.

Рабочы.

ГІСТОРЫЯ З БРЫГАДАЙ, АЛЬБО ЯК ТРЫКУТНІК ПАНЧОШНАЙ ФАБРЫКІ ІМЯ ЦЭТКІН КІРУЕ КААПГАСАМ.

Фабком фабрыкі імя Цэткін сыстэматычна з ывае арганізаваную пасылку рабочай сілы і зусім незавіцэньвае вялікай важнасьці стварэньня пастаянных брыгад Ці-ж гэта падыход фабкому да справы прапольці, калі пасылае 20 чалавек з пастаяннай брыгадай на 5 дзён, а прыходзіць з гэтай брыгады ў гаспадарку праз тры дні 6 чалавек? Або яшчэ лепшы прыклад «дыспыпліны». З ліпеня замест 55 ч. прысылаюць 22 ч. і 10 адразу ўходзяць ў горад. Хто павінен быць, колькі павінна быць рабочых,—гэтага ня ведае нават т. Лібензон, прадстаўнік фабкому.

Аб дрэнным падборы людзей сьведчыць агіднейшы ф а к т антысэмітызму. Дасланая фабкомам работніца Кавалёва адказвае брыгадзіру каапгасу: «На тую работу не пайду, калі не пашлеш яўрэйку». У сталоўцы яна лаялася на работніц розаымі контрэвалюцыйнымі, антысэміцкімі словамі. Кавалёва прышла ў каапгас дэзарганізаваць работу, сарваць прапольку і рабочае забесьпячэньне Гэта вылазка клясава варожая. Антысэміту ня месца ні на фабрыцы, ні ў каапгасе Цікава як адгукнулася на гэту вылазку Лібензон Яна замест рашучай барацьбы супроць праяў антысэмітызму, лібэральна ўпрашвае Кавалёву .. «прызнаць памылкі» (!).

Нельга сказаць, што дырэктар фабрыкі т. Ханіна ня бывае ў гаспадарцы. Яна бывае там амаль кожны дзень, але ня бачыць, што агранам Дузаў дае хлусьлівыя весткі наконт поўнай прапольці ячменю, аўсу, што 4 га капусты зарасьлі пустазельлем, не апольваюцца (ня кажам ужо пра пасадку кепскай якасьці і малай рассадай). Ханіна зусім ня ведае, што ў каапгасе няма каляндарнага пляну прапольчай і ўборчай кампаній, якасьць прапольці зусім дрэнная, не прапольна паміж радамі, трава і мурыва з баразён ня выносяцца, ня скончана праполька цыбулі, а палольны сельгасінвэнтар —конныя і ручныя плянэткі—бязьдзейна ляжаць у кузьні нясконча ными.

Зьдзельшчыны няма. У канторы ўжо месяц як няма рапартоў аб уліку рабочых з фабрыкі і зробленай імі работы. Група ў 22 ч. 3 ліпеня была пастаўлена разам, ніхто ня ведае норм выпрацоўкі і расцэнак. Брыгадзір Тарасэвіч адкрыта прызнаецца: „Улік людзей раблю толькі вечарам, бо пасьля абеду шмат разыходзіцца".

Становішча з праполкай, асабліва якасьць яе, пагражаючае. Бясспрэчна, каапгас „Сакольнікі", за такую ганебную работу зноў заслугоўвае рагожнага сьцяга, а трыкутнік фабрыкі за злачынную бязьдзейнасьць ужо „заслужыў" прынацьця да яго арганізацыйных вывадаў.

К.

Прызыў 1911 г. нараджэньня.

ВЫСОКАЯ КЛЯСАВАЯ ПІЛЬНАСЬЦЬ— АБАВЯЗКОВАЯ ЎМОВА ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПРЫЗЫВУ.

Ніводнага чужака не прапусьціць у рады РСЧА.

Да чарговага прызыву ў РСЧА застаўся невялікі час—каля трох месяцаў.

Асноўнае зьвяно ў падрыхтоўцы да прызыву—гэта клясавы адбор прызыўнікоў. Факты гавораць аб тым, што і ў гэтым годзе клясавачужы нам элемэнт робіць спробу прабрацца ў рады Чырвонай арміі і што яму не даецца належнага адпору масавымі арганізацыямі. Некалькі лічбаў. Выяўлена пакуль-што да адсеву, як чужы элемэнт 9 чалавек. На сумніцельных па клясавых адзнаках асоб зроблен 381 запыт і ўжо атрымана 60 адказаў, з якіх 14 паказваюць на наліччэ клясава-чужых элемэнтаў сярод прызыўнікоў. Гэтыя прыклады сыгналізуюць аб тым, што клясавая пільнасьць у значнай частцы мясцовых партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый не завострана. Чым, як на стратэй палітычнай пільнасьці можна тлумачыць тое, што клясава-варожыя нам элемэнты, маскуючыся, становяцца ўдарнікамі, актывістамі, а арганізацыі гэтага не заўважаюць (Луканеннаў Васіль—фанэрны завод, Кучынскі Рыгор—«Прафінтэрн»).

Ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў—вельмі важная справа. А між тым, нават гарАНА, не гаворачы ўжо аб трыкутніках прадпрыемстваў і ўстаноў, не разгарнуў бальшавіцкай работы, не мабілізаваў сіл і ўвагі на выкананьне лёзунгу «ніводнага няпісьменнага і малапісьменнага ў рады РСЧА».

Шорнік.

У Сялютах да прызыву ня рыхтуюцца.

Чым можна сёньня, гарантаваць, што з Сялюцкага сельсавету не пападуць у РСЧА чужакі, калі партыйная ячэйка і прэзыдыум сельсавету недаацэньваюць палітычнай важнасьці падрыхтоўчай работы да чарговага прызыву ў РСЧА.

Тры разы зрываўся прызначаны зьлёт прызыўнікоў. Прычыны: 2 і 4 чэрвеня дапрызыўнікі ня былі скліканы на зьлёт, а 24 чэрвеня дапрызыўнікі зьявіліся, але прадстаўнікоў ні ад сельсавету, ні ад партыйна-камсамольскай арганізацыі ня было. Прысутнічаўшы сэкратар сельсавету Каробкін ня прымаў у зьлёце актыўнага ўдзелу. Ён ліча, што «клясавы адбор прызыўнікоў і разгляд ільгот прызыўнікам ня яго справа, а справа старшыні сельсавету».

Праца з няпісьменнымі і малапісьменнымі прызыўнікамі не вядзецца. Спачатку зімы некалькі прызыўнікоў займаліся ў лікпункце, але выпуску іх яшчэ дагэтуль ня было.

Неабходна напомніць старшыні Сялюцкага сельсавету і сэкратару парт'ячэйкі, што яны ў першую чаргу павінсуць адказнасьць перад партыяй і ўрадам за падрыхтоўку да прызыву.

Цішкевіч.

Месячнік штурму бездарожжа.

Не дапусьціць зрыву месячніка.

Нягледзячы на пастанову гарсавету аб правядзеньні з 15 чэрвеня па 15 ліпеня месячніку штурму бездарожжа, у Старасельскім сельсавеце нічога па гэтым месячніку ня робіцца і работа фактычна зрываецца. Так, у вёсцы Волкава на 28 чэрвеня яшчэ ні адзін чалавек ня выйшаў на работу. Па пляне сельсавет павінен даваць штодзённа на дарожнае будаўніцтва па 40 чалавек і 36 коняй, а выходзяць па 5—6 чал.

Ня лепш абстаіць справа і па калгасах. Толькі калгас «Тружанік» вылучыў для дарожнага будаўніцтва брыгаду ў складзе 10 коняй. Прапрацаваўшы 19 і 20 чэрвеня, брыгада атрымала распараджэньне сельсавету спыніць работу. Калгасы «Камунар», «1 мая», „Новае жыцьцё", „Свабода", якія маюць нядоімку мінулага году, зусім ня прымаюць удзелу ў дарожным будаўніцтве.

Неабходна прыняць самыя тэрміновыя меры, каб не дапусьціць зрыву месячніка.

Дзесятнік Саўчанка.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЛЯГЕР АСОАВІАХІМУ

павінен стаць справай усёй пралетарскай грамадзкасьці.

Гарком КСМ і камсамольскія ячэйкі—з боку ад лягернай вучобы.

У мэтах карэннага палапшэньня якасьці лягернай работы 1933 г. і прыцягненьня да гэтай справы ўвагі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, ЦС Асоавіахіму СССР абвешчаны з 1-га чэрвеня да 30 жніўня ўсесаюзны агляд - конкурс на лепшы лягер АСО.

Конкурс мае вялікае палітычнае значэньне, і бальшавіцкае яго правядзеньне—задача ня толькі асоавіахімаўскіх арганізацый на мясцох, але і партыйных арганізацый, камсамолу, прафсаюзаў і інш. арганізацый.

Віцебскі гарсавет Асоавіахіму ўключыўся ў агляд - конкурс з недапушчальным спазьненьнем—24 чэрвеня, тады як лягерная кампанія па Віцебску пачалася 15 чэрвеня. Дапрызыўнікі першай чаргі аб конкурсе ня ведалі. Ніякай падрыхтоўчай работы сярод асоавіахімаўскай грамадзкасьці не праводзілася. Такім чынам, першая дэкада конкурсу была ўпушчана, нягледзячы на тое, што часу для падрыхтоўкі было больш чым даволі.

Вакол пытаньняў найлепшага правядзеньня лягернай кампаніі 1933 г. павінна быць сканцэнтравана ўвага ўсёй камсамольскай арганізацыі, якая, па выразе т. Варашылава, зьяўляецца «душой і целам Асоавіахіму». Вельмі дзіўна, у сувязі з тым, маўчаньне гаркому камсамолу, які «прашляпіў» падрыхтоўку да лягернага збору, нічога ня робіць па мабілізацыі камсамольскіх калектываў і ячэек вакол работы лягера і зараз.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня сталі ў належнай меры ў цэнтры ўсёй работы па балвой і палітычнай падрыхтоўцы ў віцебскім лягеры Асоавіахіму. Калі і былі заключаны паміж асобнымі ўзводамі і групамі дагаворы на сацспаборніцтва, то выкананьне іх не правяралася.

Адкрыцьцё лягеру—вялікае практычнае дасягненьне віцебскага Асоавіахіму. Абсталяваньне гнёзд і палатак сіламі сямёх дапрызыўнікоў за 2—3 дні—паказчык палітычнай сьвядомасьці тых маладых рабочых і калгасьнікаў-дапрызыўнікоў, якія прыйшлі ў лягер Асоавіахіму на баявую і палітычную вывучку. Гарсавет Асоавіахіму і гарком камсамолу павінны, як гэтага патрабуюць ад іх умовы ўсесаюзнага конкурсу-агляду, прыцягнуць увагу ўсёй грамадзкасьці да вырашэньня задачы высокаякаснага правядзеньня лягернай кампаніі 1933 г., улічыўшы дадатнае і адмоўнае першай дэкады конкурсу. Конкурс павінен быць ператворан у справу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

С. Фэйгінзон.

ЦК КП(б)Б выказвае гарачае спачуваньне ЛКСМБ і менскай партыйнай арганізацыі па повадзе заўчаснай сьмерці сэкратара Менгаркому ЛКСМБ, члена бюро ЦК ЛКСМБ і бюро МенГК КП(б)Б

МАЛЕЯ М. Г.

ЦК КП(б)Б.

ЦК ЛКСМБ з глыбокім жалем паведамляе ўвесь ЛКСМБ аб заўчаснай сьмерці актыўнага кіруючага работніка камсамолу, сэкратара Менгаркому ЛКСМБ, члена бюро ЦК ЛКСМБ

тав. МАЛЕЯ МІКОЛЫ.

ЦК ЛКСМБ.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ.

— Новы дом адпачынку для вучняў прадпрыемстваў ТП і дзяцей рабочых адчыніла таварыства „Прыхільнікі дзяцей" на станцыі Сьвяніцкага. Прапускная здольнасьць дому адпачынку складае 100 асоб у зьмену. 2 ліпеня выехала першая зьмена ў складзе вучняў панчошнай школы, якія перавыкналі прамфінплян.

— Для лепшага абслугоўваньня бібліятэрлягераў бібліятэка Дому асьветы арганізавала 5 перасовачных бібліятэк. Адначасова Дом асьветы вядзе праверку літаратуры сталых бібліятэк.

— Перапіс будаўніцтва 1931—32 году і вынікаў работы па ахове здароўя за першую пяцігодку па Віцебшчыне правёў наргасвузтат.

ДЗЕНЬНІК ЛІТАРАТУРЫ.

— Для ўдзелу ў правядзеньні с.-г. кампаніі на раёны выяжджалі члены Віцебскага саюзу савецкіх пісьменнікаў тт Люгоўскі, Шыракоў Казанскі, Жалязьняк і Рэлес. За пасеўнай кампаніі імі напісаны рад нарысаў і вершаў, як верш „Наш май" і нарыс „Працуецца з Правілавым" — Жалязьняка, нарысы „Штурм", „Першае ворыва", „Другое жыцьцё", —Шыракова, вершы „Пра хлеб і матулю",—Люгоўскага і нарысы „Борагі" і „Брыгада № 1"—Ушакова.

— У першай палове ліпеня выходзяць з друку зборнік вершаў Андрэя Ўшакова „Праца і моладасьць" калектыўны зборнік Люгоўскага і Жалязьняка „Першы вытоп". Адначасова рыхтуецца да друку зборнік творчасьці Казанскага і Рэлеса.

— Вышаў з друку новы зборнік вершаў Андрэя Ўшакова „Зарава вагранак".

— Для лепшага ўдзелу пісьменьнікаў у чыстцы партыі аргкамітэт саюзу савецкіх пісьменьнікаў прымацаваў усіх пісьменьнікаў да прадпрыемстваў гораду. Літгурток заводу „Чырвоны мэталіст" арганізаваў літаратурную старонку ў шматтыражцы „Мэтпромавец", прысьвечаную чыстцы партыі.

У сувязі з паступаючымі запытаньнямі наконт ПАРАДКУ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ РАБОЧЫХ, СЛУЖАЧЫХ І СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ АД'ЯЖДЖАЮЦЬ У АДПАЧЫНАК у іншыя гарады, РАСТЛУМАЧВАЕЦЦА, што адпускнікі павінны ЗДАЦЬ СВАЕ НАБОРНЫЯ КАРТКІ ПА МЕСЦЫ ЖЫХАРСТВА і пры прадстаўленьні даведак аб зьяўцці з вучоту ПАВІННЫ БЫЦЬ УЗЯТЫ НА СНАБЖЭНЬНЕ ХЛЕБАМ У МЯСЦОВАСЬЦЯХ, КУДЫ ЯНЫ ПРЫЯЖДЖАЮЦЬ, па сьпісах, паказаных у даведках.

Інспэктар гарснабу ПАГОСКІН.

Даводзіцца да ведама ўсіх ЖАКТаў, устаноў і домаўласьнікаў, што ПЫТАНЬНІ АФАРБОЎКІ ФАСАДАЎ ДАМОЎ, а таксама пачынкі тратуараў і рамонту вуліц, згодна пастановы Віцгарсавету ад 19 мая г. г., павінны АБАВЯЗКОВА УЗГАДНЯЦЦА З СЭКТАРАМ ДАБРАБЫТУ камгаса.

Гаркамгас.

585—3—3

Віцебскі мэханіка-энэргетычны палітэхнікум адкрывае прыём

заяў на залічэньне ў палітэхнікум. Прымаюцца на групы студзёнай і гарачай апрацоўкі м таляў, групы электрыкаў і цёплатэхнікаў. Залічваюцца асобы, скончыўшыя 7 годку і 9 годку.

Іспыты будуць вытвараецца з 1—10 верасьня.

Пры падачы заявы неабходна прыкласьці наступныя дакументы: а) анкету, засьведчаную прафэсыйнымі, камсамольскімі арганізацыямі, альбо ўстановамі, б) мэтрычны выпіс аб нараджэньні, в) пасьведчаньне аб адукацыі, г) даведку аб сацыяльным паходжаньні, д) ад сялян—даведку аб суме падатку за 1932 год, е) даведку аб с т а н е здароўя, ж) дзьве фатакарткі і дзьве 20-кап. паштовыя маркі.

525—4—3

ВІЦЕБСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА

(вул. Талстога, 16) АБВЯШЧАЕ набор вучняў на 1933|34 навучальны год па наступных клясах: народных і духавых інструмэнтаў, сьпеваў, раяля, скрыпкі, віалянчэлі і кантрабасу.

Прыём заяў вытвараецца з 25 ліпеня да 15 жніўня. Бланкі заяў і анкет можна атрымаць у канцалярыі школы, пачынаючы з 25 ліпеня штодзённа з 10 гадз. да 12 раніцы і з 6 да 8 гадз. увечары, апрача дзён адпачынку: 3, 9, 15, 21 і 27.

607—2—2

У ноч з 29 на 30 чэрвеня ў гарадоцкім камнезагат ўчым вучастку пры ст. Езярышча УКРАДЗЕН КОНЬ—мерын вішнёва-гнядой масьці, 8 год, рост 148 см., грыва на правы бок. Указаўшаму месцазнаходжэньне каня будзе выдадзена УЗНАГАРОДА. Просьба ПАВЕДАМІЦЬ па адрасе: ЕЗЯРЫШЧАНСКІ КАМНЕЗАГАТОЎЧЫ ВУЧАСТАК.

609—3—1

УКРАДЗЕНА КРУГЛАЯ ПЯЧАТКА хлебазавода № 2, якую лічыць несапраўднай.

610

Згублена ДАМАВАЯ КНІГА дому № 3 па Гогалеўскай вуліцы, якую лічыць несапраўднай.

611

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Газета № 12. Друкарня „Камінтэрн", Бальшавіцкая, 9